Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 156 (5830) | 9 ліпеня 1937 г., пятніца | ЦАНА 10 КАП.

„Мы стаім за мір і адстойваем справу міру. Але мы не баімся пагроз і гатовы адказаць ударам на ўдар падпальшчыкаў вайны“ (Сталін). Пазыкай Умацавання Абароны Саюза ССР яшчэ больш узмоцнім нашу родную Чырвоную Армію—аплот міру ва ўсім свеце!

КОМСАМОЛУ—КАНКРЭТНАЕ ПАРТЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА

Сёння мы публікуем пастановы Пленума ЦК КП(б)Б аб ходзе выбараў комсамольскіх і прафесіянальных арганізацый. Гэтыя пастановы яшчэ раз падкрэсліваюць усю важнасць вырашэння асноўнай палітычнай задачы сучаснага перыяду—усямерна павышаць рэволюцыйную пільнасць, выкарчоўваць да канца ворагаў народу і як можна хутчэй ліквідаваць вынікі шкодніцтва.

У комсамольскіх арганізацыях праходзяць зараз справаздачна-выбарчыя сходы. Адданыя выхаванцы камуністычнай партыі, змагаючыся з ворагамі народу, комсамольцы яшчэ больш згуртоўваюць свае рады вакол комуністычнай партыі і вялікага Сталіна. Аднак, комсамольскія арганізацыі ў барацьбе за карэннае паляпшэнне работы комсамола і выкарчоўванне ворагаў народу з сваіх радоў маюць патрэбу ў вопытным кіраўніцтве, чаго, на жаль, да гэтага часу не зразумеў рад партыйных арганізацый. Райком КП(б)Б Асіпавіцкага раёна падчыў, напрыклад, магчымым увесь свой удзел у выбарах комсамольскіх органаў абмежаваць вынясненнем рэзалюцыі. На сходах пярвічных арганізацый комсамола райвыканкома, аддзялення Дзяржбанка і на іншых прадпрыемствах комуністы нават не прысутнічалі. Гэтак-жа сама справа абстаіць у Круглянскім і Жыткавіцкім раёнах.

Комсамол—важнейшая палітычная арганізацыя краіны. Ухіленне ад кіраўніцтва такой арганізацыяй шкодна і абсалютна непрыпіма, тым больш у такі адказны для комсамола перыяд, калі ён праводзіць справаздачна-выбарчыя сходы пярвічных арганізацый. Райкомы КП(б)Б, якія ўхіліліся ад кіраўніцтва выбарамі ў пярвічных комсамольскіх арганізацыях, думаюць, відавочна, што комсамол адгароджан кітайскай сцяной ад жыцця. Між тым, абсалютна ясна і не патрабуе ніякіх доказаў, што бясклопатнасць—гэта ідыёцкая хвароба, на якую аказаліся хворымі рад партыйных арганізацый,—уласціва і комсамольскім арганізацыям. Нельга думаць, напрыклад, што Бенек, Дзякаў, Убаравіч і інш. ворагі народу, якія мелі сваю агентуру ў радзе партыйных арганізацый, не прабавалі пранікнуць у комсамол. Калі ў КП(б)Б пачала разгортвацца сур'ёзная работа па выкрыцці ворагаў народу і ўжо раскрыт рад бандыцкіх гнёздаў, то ў ЛКСМБ гэта выкрываўчая работа яшчэ амаль не пачата. На справаздачна-выбарчых сходах у комсамольскіх арганізацыях сёе-тое зроблена ў гэтым напрамку. Аднак, як зусім правільна падкрэсліў ЦК КП(б)Б, у комсамольскіх арганізацыях работа па выкрыцці агентаў япона-германскага і польскага фашызма—трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх бандыдаў ідзе ўсё яшчэ нездавальняюча.

Пленум ЦК КП(б)Б указаў, што «партыйна-комсамольскія арганізацыі Беларусі павінны арганізаваць шырокае растлумачэнне масам комсамольцаў і моладзі ўрокаў здрадніцкай, шпіёнска-шкодніцкай дзейнасці япона-германскіх і польскіх шпіёнаў, узняць вышэй рэволюцыйную пільнасць комсамольцаў і моладзі, выхоўваючы іх у духу нянавісці і непрыпімасці да ўсякіх спроб антысавецкай дзейнасці і агітацыі, у духу рашучага выкрыцця ворагаў народу, як-бы яны ні маскіраваліся.

Пленум даручае партыйна-комсамольскім арганізацыям БССР арганізаваць шырокае вывучэнне комсамолам і ўсёй моладзю металаў і прыёмаў работы замежных разведвальных органаў і іх трацкісцка-бухарынскай і нацыянал-фашысцкай агентуры».

У патрабаванні павысіць рэволюцыйную пільнасць, выкарчоўваць ворагаў народу бязлітасна і да канца, у патрабаванні канкрэтна кіраваць работай комсамола па павышэнню рэволюцыйнай пільнасці і разгортваннем крытыкі і самакрытыкі ў комсамоле супроць дабрадушнасці, ратавейства, пярпімасці да ворагаў народу — галоўны сэнс пастановы Пленума ЦК КП(б)Б аб ходзе выбараў комсамольскіх органаў.

Пленум ЦК КП(б)Б адзначыў, што Менскі гарком КП(б)Б, Дзержынскі, Камарынскі, Лагойскі, Клімавіцкі, Сенненскі і рад іншых райкомаў КП(б)Б не спраўляюцца ў дастатковай ступені з задачай аператыўнага кіраўніцтва ходам выбараў комсамольскіх органаў. Рад райкомаў не зразумеў яшчэ галоўнай задачы кіраўніцтва комсамолам, у выніку чаго выбары ў многіх комсамольскіх арганізацыях праходзяць яшчэ на нізкім палітычным узроўні.

Дрэнна ў ЛКСМБ пастаўлена выхаваўчая работа сярод комсамольцаў і моладзі. Пленум патрэбаваў ад партыйных арганізацый аказваюць комсамолу штодзённую дапамогу ў справе падняцця на належны ўзровень прапагандысцкай і агітацыйнай работы сярод комсамольскай моладзі. Совецкую моладзь трэба выхоўваць у духу рэволюцыйных традыцый народаў СССР і іх гераічнай барацьбы за социялізм, супроць ворагаў народу, якой-бы маскай яны ні прыкрываліся, у духу адданасці сваёй вялікай партыі Леніна—Сталіна і совецкага патрыятызма.

У радах комсамола ёсць тысячы адданых партыі Леніна—Сталіна комсамольцаў і комсамолак, якія гатовы ўступіць у партыю. Не чым іншым як неразуменнем значэння комсамола, як магутнага рэзерва большэвіцкай партыі, нельга вытлумачыць адсутнасць работы па ўцягненню ў партыю лепшых людзей з комсамола. Гэту нічым не апраўданую бестурботнасць пленум ЦК КП(б)Б асудзіў. «Падрыхтоўка — гаворыцца ў рашэннях Пленума— для ўступлення ў партыю лепшых, адданых, палітычна правераных комсамольцаў, загартаваных у барацьбе з ворагамі комунізма — заўсёды з'яўлялася ганаровай задачай комсамола.

Пленум ЦК КП(б)Б прапануе ўсім партыйным і комсамольскім арганізацыям, у адпаведнасці з рашэннем ЦК ВКП(б) аб адпаўленні прыёму новых членаў партыі, разгарнуць энергічную работу па ўцягненню лепшых, палітычна правераных, загартаваных у барацьбе з ворагамі комунізма комсамольцаў, актыўных работнікаў комсамола ў рады большэвіцкай партыі.

Пленум папярэджвае комсамольскія арганізацыі аб неабходнасці дакладнай праверкі ўсіх рэкамендуемых у партыю і прадстаўлення рэкамендацый комсамольцам, уступаючым у партыю ў строга індывідуальным парадку».

І факт цягі комсамольцаў у партыю, і разгарнуўшаяся ў радзе комсамольскіх арганізацый самакрытыка недахопаў работы ў комсамоле, і праяўляючаяся гатоўнасць многіх комсамольцаў бязлітасна змагацца з ворагамі народу, як можна хутчэй ліквідаваць вынікі шкодніцтва, — паказвае, што ў комсамоле выраслі выдатныя людзі, здольныя перабудаваць работу ў комсамоле. Задача заключаецца ў тым, каб вылучыць гэтых лепшых людзей на кіруючую комсамольскую работу і забяспечыць ім усе ўмовы для работы. Асаблівую ўвагу партыйныя арганізацыі павінны аддаць вылучэнню на кіруючую работу жаночай моладзі.

ЛКСМБ расце і мацнее. З кожным днём расце аўтарытэт ленінскага комсамола ў асяродзі рабочай і калгаснай моладзі. ЛКСМБ мае ўсе ўмовы для далейшага магутнага колькаснага росту. Пара ўжо вакол комсамольцаў-адзіночак стварыць палыя арганізацыі комсамола, пара ўжо дабівацца таго, каб, па крайняй меры, у кожным пагранічным калгасе ўжо ў бліжэйшым часе была комсамольская арганізацыя.

Перад комсамолам Беларусі стаяць адказныя задачы. Комсамольцы павінны ачысціць свае рады ад ворагаў, якія прабуюць выкарыстаць комсамольскі білет у сваіх шкодніцкіх мэтах. Партыйныя арганізацыі павінны дапамагчы комсамолу выканаць задачы, якія стаяць перад ім. Усю сілу кіраўніцтва, увесь вопыт работы партыйныя арганізацыі павінны скарыстаць для таго, каб падняць рэволюцыйную пільнасць у комсамольцаў і, такім чынам, падрыхтаваць арганізацыю комсамола да надыходзячых выбараў у Вярхоўны Совет социялістычнай дзяржавы рабочых і сялян.

МІНІСТР ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ ШВЕЦЫІ П. САНДЛЕР ПРЫБЫЎ У МАСКВУ

8 ліпеня ў Маскву прыбыў з афіцыяльным візітам міністр замежных спраў Швецыі п. Сандлер. Міністра суправаджаюць генеральны сакратар міністэрства замежных спраў п. Гюнтэр і сакратар п. Бельфрат. Разам з міністрам у Маскву прыбыла паўнамочны прадстаўнік СССР у Швецыі тав. Калантай.

Міністр і суправаджаючыя яго асобы прыбылі на самалёце шведскай паветранай кампаніі «АБА».

На Тушынскім аэрадроме п. Сандлера сустралі Народны Камісар Замежных Спраў тав. Літвінаў, Нам. Наркома Замежных Спраў тав. Пацёмкін, член прэзідыума Маскоўскага Совета тав. Штэрнберг, загпратакольнага аддзела НКЗС тав. Нікалаеў і інш.

АМЕРЫКАНСКІ ДРУК ПРА ПАЛАЖЭННЕ АБ ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ СССР

НЬЮ-ЙОРК (буйнейшы цэнтр ЗША) 6 ліпеня. (БЕЛТА). Газета «Геральд трыбюн» піша, што праект Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР «уключае ўсе дэмакратычныя рысы выбарнай працэдуры, прадугледжаныя новай Совецкай Канстытуцыяй. Пры выбарах новага Вярхоўнага Совета СССР, якія адбудуцца гэтай восенню, совецкі народ будзе карыстацца прывілеямі, якія былі невядомы на працягу тысячагодняй гісторыі Расіі».

РЭЗАЛЮЦЫІ ПЛЕНУМА ЦК КП(б)Б

АБ ХОДЗЕ ВЫБАРАЎ У КОМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯХ

Пастанова пленума ЦК КП(б)Б

Заслухаўшы даклад сакратара ЦК ЛКСМБ т. Аўгустайціса, сакратара Менскага ГК КП(б)Б тав. Літвіна і сакратара Дзержынскага РК КП(б)Б тав. Мар'янава, пленум ЦК КП(б)Б адзначае, што выбары ў комсамольскіх арганізацыях на аснове тайнага галасавання прывялі да ўздыму палітычнай актыўнасці комсамольцаў, развароту большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі недахопаў работы комсамольскіх арганізацый і стварэння ўмоў для далейшага паляпшэння комсамольскай работы.

Разам з тым пленум адзначае, што выбары ў многіх комсамольскіх арганізацыях г. Менска, Дзержынскага, Камарынскага, Лагойскага, Клімавіцкага, Сенненскага і раду іншых раёнаў праходзяць яшчэ на нізкім палітычным узроўні. У радзе комсамольскіх арганізацый не разгорнута сапраўдная большэвіцкая крытыка і самакрытыка; наглядаюцца факты парушэння ўнутрысаюзнай дэмакратыі і прынцыпаў тайнага галасавання; усё яшчэ нездавальняюча ідзе работа па выкрыццю агентаў япона-германскага і польскага фашызма — трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх бандытаў.

Комсамольскія арганізацыі яшчэ дрэнна выконваюць рашэнні III пленума ЦК ВЛКСМ аб умацаванні пярвічных комсамольскіх арганізацый, аб ліквідацыі так званых комсамольцаў-адзіночак, аб узбуйненні малалікіх комсамольскіх арганізацый за кошт смелага ўцягнення перадавой моладзі ў комсамол.

Усё гэта з'яўляецца вынікам таго, што ЦК ЛКСМБ, АК, ГК і РК комсамола недастаткова аператыўна кіруюць і аказваюць практычную дапамогу пярвічным арганізацыям у правядзенні выбараў.

Пленум лічыць зусім недастатковым партыйнае кіраўніцтва выбарамі комсамольскіх органаў з боку Менскага ГК КП(б)Б, Дзержынскага і іншых РК КП(б)Б, што і з'явілася адной з прычын нізкага палітычнага ўзроўню выбараў у комсамольскіх арганізацыях у радзе раёнаў Беларусі.

Пленум ЦК КП(б)Б асабліва падкрэслівае, што толькі непасрэдны практычны ўдзел усяго партыйнага актыва, пярвічных арганізацый, а таксама комсамольскага актыва ў падрыхтоўцы і правядзенні комсамольскіх сходаў паправіць маючыяся памылкі, дапушчаныя ў правядзенні выбараў, і забяспечыць правядзенне выбарчых сходаў на высокім ідэйна-палітычным ўзроўні.

Усім АК, ГК і РК КП(б)Б заслухаць даклады сакратароў РК ЛКСМБ аб ходзе выбараў; склікаць сходы партыйна-комсамольскага актыва, на якіх абмеркаваць меры па выкананню рашэння пленума ЦК КП(б)Б аб ходзе выбараў у комсамольскіх арганізацыях.

Пленум прапануе рэспубліканскаму і раённаму друку шырока асвятляць ход выбараў комсамольскіх органаў.

Падрыхтоўка для ўступлення ў партыю лепшых, адданых, палітычна правераных комсамольцаў, загартаваных у барацьбе з ворагамі комунізма — заўсёды з'яўлялася ганаровай задачай комсамола.

Аднак пленум ЦК КП(б)Б указвае, што не гледзячы на тое, што ў комсамоле ёсць тысячы адданых партыі Леніна — Сталіна комсамольцаў і комсамолак, гатовых уступіць у КП(б)Б, райкомы і гаркомы комсамола адмаўляюцца ад уцягнення комсамольцаў у рады КП(б)Б, не даючы ім рэкамендацый.

Пленум ЦК КП(б)Б лічыць, што адмаўленне ад ўцягнення комсамольцаў у рады КП(б)Б паказвае неразуменне значэння комсамола, як рэзерва большэвіцкай партыі.

Пленум ЦК КП(б)Б прапануе ўсім партыйным і комсамольскім арганізацыям, у адпаведнасці з рашэннем ЦК ВКП(б) аб адпаўленні прыёму новых членаў партыі, разгарнуць энергічную работу па ўцягненню лепшых, палітычна правераных, загартаваных у барацьбе з ворагамі комунізма комсамольцаў, актыўных работнікаў комсамола ў рады КП(б)Б, не даючы ім рэкамендацый.

Пленум папярэджвае комсамольскія арганізацыі аб неабходнасці дакладнай праверкі ўсіх рэкамендуемых у партыю і прадстаўлення рэкамендацый комсамольцам, уступаючым у партыю ў строга індывідуальным парадку.

Партыйна-комсамольскія арганізацыі Беларусі павінны арганізаваць шырокае растлумачэнне масам комсамольцаў і моладзі ўрокаў здрадніцкай, шпіёнска-шкодніцкай дзейнасці япона-германскіх і польскіх шпіёнаў, узняць вышэй рэволюцыйную пільнасць комсамольцаў і моладзі, выхоўваючы іх у духу нянавісці і непрыпімасці да ўсялякіх спроб антысавецкай дзейнасці і агітацыі, у духу рашучага выкрыцця ворагаў народу, як-бы яны ні маскіраваліся.

Пленум даручае партыйна-комсамольскім арганізацыям БССР арганізаваць шырокае вывучэнне комсамолам і ўсёй моладзю металаў і прыёмаў работы замежных разведвальных органаў і іх трацкісцка-бухарынскай і нацыянал-фашысцкай агентуры.

Пленум ЦК лічыць асноўнай задачай ЛКСМБ у перыяд правядзення выбараў комсамольскіх органаў дабіцца паляпшэння кіраўніцтва комсамольскімі пярвічнымі арганізацыямі, у асаблівасці калгаснымі і пагранічнымі; умацаваць іх арганізацыйна, дабіўшыся павелічэння росту ЛКСМБ за лік перадавой моладзі з тым, каб у большасці калгасаў БССР на працягу 1937 г. і пачатку 1938 года былі-б створаны пярвічныя комсамольскія арганізацыі.

Усе партыйныя арганізацыі КП(б)Б павінны неадкладна прыняць меры па аказанню дапамогі комсамольскім арганізацыям у справе ўзняцця на належны ўзровень прапагандысцкай і агітацыйнай работы сярод комсамольцаў і моладзі; дапамагчы комсамольскім арганізацыям кваліфікаванымі прапагандыстамі, арганізаваць для комсамольскіх прапагандыстаў спецыяльныя кансультацыі ў партгабінетах па павышэнню іх кваліфікацыі, узмацніць паўсядзённае кіраўніцтва АК, ГК і РК КП(б)Б выхаваўчай работай у комсамоле.

Пленум лічыць важнейшай палітычнай задачай партыйных і комсамольскіх арганізацый — правядзенне шырокага вылучэння лепшых комсамольцаў, і ў асаблівасці дзяўчат, на кіруючую совецкую, гаспадарчую, профсаюзную, кааперацыйную і калгасную работу.

Пленум ЦК КП(б)Б звяртае ўвагу ўсіх партыйных і комсамольскіх арганізацый на тое, што пры выбарах кіруючых комсамольскіх органаў неабходна намячаць і выбіраць самых перадавых людзей, правераных палітычна, адданых большэвіцкай партыі, выпрабаваных на практычнай рабоце, людзей, упарта працуючых над сваёй марксісцка-ленінскай адукацыяй.

Пленум ЦК КП(б)Б прапануе ўсім партыйным і комсамольскім арганізацыям, кіруючыся рашэннямі лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б), дакладам і заключнай прамовай тав. Сталіна, правесці выбары комсамольскіх органаў на высокім палітычным узроўні, узняць актыўнасць шырокіх мас комсамольцаў, знішчыць маючыяся буйнейшыя недахопы ў рабоце комсамольскіх арганізацый Беларусі, узмацніць выхаваўча-арганізацыйную работу сярод моладзі з тым, каб падрыхтаваць комсамольскія арганізацыі і несаюзную моладзь да выканання важнейшай задачы — прадстаячых выбараў у Вярхоўны Совет на аснове Сталінскай Канстытуцыі.

АБ ХОДЗЕ ВЫБАРАЎ ПРОФСАЮЗНЫХ ОРГАНАЎ

Пастанова пленума ЦК КП(б)Б

Заслухаўшы даклады сакратара Гомельскага ГК КП(б)Б тав. Стакуна, Рэчыцкага РК КП(б)Б — тав. Рыкава, старшыні ЦП тарфянікаў — тав. Бедэржыцкага, НП МТС — тав. Коліка аб ходзе выбараў профсаюзных органаў, Пленум ЦК КП(б)Б прызнае, што ў выніку пачаўшыхся справаздачна-выбарчых сходаў профарганізацый на аснове шырокага разгортвання профсаюзнай дэмакратыі і закрытага (тайнага) галасавання павысіўся ўзровень большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі недахопаў работы профсаюзаў з боку членаў профсаюзаў і ўзнялася палітычная актыўнасць рабочага класа. Працоўныя масы, выкрываючы ворагаў народу і выкарчоўваючы іх, яшчэ шчыльней згуртаваліся вакол комуністычнай партыі і вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна.

Адначасова Пленум ЦК адзначае, што ЦК і ЦП саюзаў нездавальняюча арганізоўваюць і кіруюць гэтай важнейшай палітычнай кампаніяй.

Кіраўнікі ЦП і ЦК саюзаў, і ў асаблівасці МТС, тарфянікаў, запалкі і фанеры, друкароў, дзяржустаноў не зрабілі яшчэ ўсяго неабходнага, каб у выніку справаздачна-выбарчых сходаў стварыць магутны ўздым у масах, карэнным чынам палепшыць работу профсаюзаў; не зрабілі практычных і палітычных вываадаў, выцякаючых з трэх-юніяніскіх хвароб профарганізацый і фактаў контрэволюцыйнай, шпіёнска-шкодніцкай работы агентаў япона-германскага і польскага фашызма ў гаспадарчых, совецкіх, профсаюзных і іншых арганізацыях Беларусі, дрэнна мабілізуюць членаў саюзаў на ліквідацыю вынікаў шкодніцтва і далейшае выкрыццё і выкарчоўванне ворагаў народу.

У практыцы правядзення справаздачна-выбарчых сходаў мелі месца рад палітычных скажэнняў: парушэнне ўнутрысаюзнай дэмакратыі, прынцыпаў тайнага галасавання, наяўнасці адміністравання ў кіраўніцтве выбарамі і т. д.

Усё гэта сведчыць таксама аб нездавальняючым кіраўніцтве выбарамі з боку райкомаў, гаркомаў і акругкомаў партыі.

Пленум ЦК КП(б)Б **пастанаўляе:**

Прапанаваць АК, ГК і РК КП(б)Б, ЦП і ЦК саюзаў абмеркаваць ход выбараў профсаюзных органаў, намеціць канкрэтныя меры, якія-б забяспечылі выкананне рашэнняў VI пленума ВЦСПС і разгортванне большэвіцкай самакрытыкі і крытыкі недахопаў профсаюзнай работы, павышэнне рэволюцыйнай пільнасці і мабілізацыю мас на ліквідацыю вынікаў шкодніцтва, выкрыццё і выкарчоўванне япона-германскіх і польскіх шпіёнаў, дыверсантаў і шкоднікаў.

Пленум ЦК звяртае ўвагу ўсіх профарганізацый на неабходнасць павышэння работы па палітычнаму і культурнаму выхаванню членаў саюза, умацаванню працоўнай дысцыпліны і ўздыму стаханаўскага руху, паляпшэнню работы па матэрыяльна-бытавому абслугоўванню членаў саюза і поўнаму правядзенню мерапрыемстваў па ахове працы і тэхнікі бязапаснасці.

Пленум асабліва падкрэслівае, што гаркомы, райкомы, акругкомы партыі, ЦК і ЦП саюзаў у перыяд выбараў павінны забяспечыць вылучэнне ў кіруючыя профсаюзныя органы новых кадраў, асабліва з жанчын, паказаўшых сябе на рабоце, праверапых па дзелавых і палітычных якасцях, арганізаваўшы работу па іх палітычнаму выхаванню і дапамозе ім у практычнай рабоце.

Пленум абавязвае Бюро ЦК, гаркомы і райкомы забяспечыць правядзенне на высокім палітычным узроўні рэспубліканскіх, гарадскіх і раённых канферэнцый профсаюзаў, умацаваўшы кіруючыя профсаюзныя органы праверанымі большэвіцкімі кадрамі.

Пленум ЦК абавязвае рэспубліканскі і раённы друк забяспечыць шырокае асвятленне ходу выбараў профсаюзных органаў.

Пленум абавязвае Бюро ЦК, акругкомы, гаркомы і райкомы КП(б)Б арганізаваць кіраўніцтва справаздачна-выбарчымі сходамі профсаюзаў так, каб забяспечыць хутчэйшую ліквідацыю буйнейшых палітычных хамылак і недахопаў у рабоце профсаюзаў Беларусі.

4-я СЕСІЯ ЦВК САЮЗА ССР VII СКЛІКАННЯ

Спрэчкі па дакладу тав. Я. А. ЯКАЎЛЕВА

Ранішняе пасяджэнне 8 ліпеня

На ранішнім пасяджэнні Сесіі 8 ліпеня пачаліся спрэчкі па дакладу тав. Я. А. **Якаўлева** аб праекце «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР».

Па прапанове раду членаў ЦВК СССР сесія зноў абмеркавала пытанне аб парадку спрэчак па дакладу тав. Я. А. Якаўлева.

Сесія змяніла сваё рашэнне, прынятае напярэдадні, і пастанавіла весці абмеркаванне даклада на сумесным пасяджэнні абодвух палат — Саюзнага Совета і Совета Нацыянальнасцей.

Аб'яднанае пасяджэнне адкрывае тав. М. І. **Калінін.** За сталом прэзідыума — таварышы **Молатаў, Андрэеў, Чубар, Касіор, Хрушчоў, Якаўлеў** і інш.

Першым выступае старшыня Совета Народных Камісараў Украінскай ССР тав. **Любчэнка.** У сваёй прамове ён характарызуе выбарчы закон совецкай дзяржавы, як гістарычны закон Сталінскай эпохі. Асноўная задача якога—забяспечыць сапраўдны ўздзел усіх працоўных у выбарах.

— Наш выбарчы закон не падобен, ды і не можа быць падобен ні на адзін выбарчы закон капіталістычнай краіны, — падкрэслівае тав. Любчэнка. І гэту асноўную думку ён ілюструе прыкладамі з практыкі асобных капіталістычных краін. Урады гэтых краін робяць усё для таго, каб абкарнаць назат тыя правы працоўных, якія запісаны ў буржуазнай канстытуцыі. Польскія паны аказаліся віртуозамі ў стварэнні выбарчай сістэмы, якая адзекуецца з польскага народу. Вось чаму на апошніх выбарах у польскі сейм галасавала толькі 28 процантаў насельніцтва, а 72 процанты чакалі больш зручнага выпадку, каб адкрыта галасаваць супроць фашысцкага лагера.

Наш выбарчы закон па праву з'яўляецца самым дэмакратычным. Следам за Сталінскай Канстытуцыяй ён яшчэ раз пацвярджае, што социялізм і дэмакратыя, як гаварыў таварыш Сталін, непераможны.

— Працоўныя Совецкай Украіны, — заканчвае пад апладысменты сваю прамову таз. Любчэнка, — цалкам і поўнасцю ўхваляюць «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» таму, што на аснове гэтага выбарчага закона працоўныя нашай краіны могуць паслаць у Советы лепшых сыноў партыі і народа, да канца адданых вялікай справе Леніна—Сталіна.

— Совецкі выбарчы закон народжан Сталінскай Канстытуцыяй, — гаворыць выступіўшы затым старшыня Куйбышэўскага аблвыканкома тав. **Полбіцын.** Кожны артыкул гэтага закона адлюстроўвае рысы новага грамадзтва, створанага социялістычнай рэволюцыяй.

Віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук Украінскай ССР акад. **Шліхтэр** прысвячае сваю прамову пытанням узмацнення палітычнай пільнасці.

— Ворагі напрабуюць скарыстаць падрыхтоўку і выбары ў Вярхоўны Совет для падрыву магутнасці совецкай дзяржавы,—гаворыць ён. — Ужо зараз мае месца ажыўленне работы паркоўнікаў.

На мясцах недастаткова прадумалі ўказанне таварыша Сталіна аб пільнасці. Іменна таму мы не здолелі своечасова выкрыць ворагаў народу, агентаў япона-германскага фашызма. Мы, украінцы, не здолелі выкрыць, напрыклад, Якіра, подлага агента гестапо.

Фашысцкія гаспадары ворагаў народу, выкрытых Наркаматам унутраных спраў, стараюцца паказаць выкрыццё фашысцкіх шпіёнаў, як прызнак нашай слабасці. Але гэта ім не ўдасца! Разгром агіднай трацкісцка-бухарынскай банды шпіёнаў, дыверсантаў, забойц ёсць лепшы доказ непахіснай магутнасці краіны социялізма. На вылазкі ворагаў совецкі народ адказвае пазыкай умацавання абароны. Наш народ згуртован, як ніколі, вакол Цэнтральнага Камітэта партыі, вакол правадыра народаў таварыша Сталіна.

Далей атрымлівае слова старшыня Совета Народных Камісараў Казахскай ССР тав. **Ісаеў.** Ён падкрэслівае асабліва артыкулы выбарчага закона, якія датычаць рэспублік Усхода і раёнаў крайняй Поўначы, і забяспечваюць пагалоўны ўдзел у выбарах у Вярхоўны Совет СССР.

Пасля перапынку з вялікай яркай прамовай выступае пракурор СССР тав. **Вышынскі.**

— Народу, які мае такую Канстытуцыю, як Сталінская Канстытуцыя,—гаворыць тав. Вышынскі,—не страшны палкопы ворагаў, як-бы страшэнны і каварны не былі сродкі барацьбы, якія пускаюць у ход супроць СССР фашысцкія разведкі і іх трацкісцка-бухарынская агентура.

Социялізм і дэмакратыя непераможны!

Прайшоўшыя за апошнія два гады працэсы трацкісцка-бухарынскіх бандытаў, здраднікаў і дыверсантаў, прапэс шпіёнскай банды Тухачэўскага і К° паказалі, што ворагі, як-бы яны ні маскіраваліся, будуць заўсёды выкрыты і бязлітасна знішчаны.

Заканчваючы сваю прамову пад доўгія апладысменты залы, тав. Вышынскі гаворыць:

— Вялікая Сталінская Канстытуцыя і новы выбарчы закон забяспечаць поўны трыумф социялістычнай дэмакратыі і социялістычнай законнасці.

— Сталінская Канстытуцыя, — адзначае ў сваёй прамове старшыня ЦВК Грузінскай ССР тав. **Махарадзе,** — стала фактарам далейшага хуткага росту і ўмацавання Совецкага Саюза.

Старшыня Песчанскага сельсовета, Харкаўскай вобласці, тав. **Батрачэнка** гаворыць на украінскай мове. Яна паказвае, да чаго прыводзіла захапленне сельсоветаў фінансавай работай і як змянілася становішча пасля прыняцця Сталінскай Канстытуцыі. Старшыня сельсовета пайшоў у клубы, гурткі, ажывіў работу секцый. Там, дзе гэта зрабілі, вырашылі асноўную задачу сельсовета — забяспечыць далейшы культурны рост сяла.

Выступаючая затым тав. **Казначэева** (Усходняя Сібір), як і тав. Батрачэнка, заклікае арганізавана сустрэць выбары, забяспечыць найлепшую рэалізацыю выбарчага закона і не дапусціць ні аднаго ворага ў совецкія органы.

Пасля выступлення тав. Казначэевай аб'яўляецца перапынак. (БЕЛТА).

4-я СЕСІЯ ЦВК САЮЗА ССР VII СКЛІКАННЯ

АБ ПРАЕКЦЕ „ПАЛАЖЭННЯ АБ ВЫБАРАХ У ВЯРХОУНЫ СОВЕТ СССР“

Даклад т. ЯКАЎЛЕВА Я. А. 4-й сесіі ЦВК СССР VII склікання 7 ліпеня 1937 года)*

Для вайсковых часцей і вайсковых злучэнняў праект прадугледжвае арганізацыю выбарчых участкаў з колькасцю не менш 50 і не больш 1.500 выбаршчыкаў. Такім чынам, будзе дадзена магчымасць прыняць удзел у выбарах самым дробным вайсковым часцям, якія ахоўваюць рубяжы СССР. Асобы, якія знаходзяцца ў арміі, але не ўваходзяць у вайсковыя часці ці вайсковыя злучэнні, як, напрыклад, работнікі Наркамата Абароны, згодна гэтаму праекту, будуць прымаць удзел у галасаванні нараўне з астатнімі грамадзянамі СССР па месцу сэайго жыхарства.

Выбары будуць адбывацца ў адзін з нерабочых дзён з 6 гадзін раніцы да 12 гадзін ночы. Як відаць, прыдзецца выбраць адну з нядзель, як нерабочы дзень у вёсцы. Пажадана пры гэтым выбраць тую нядзелю, з якою супадаў-бы выходны дзень у горадзе.

Для падліку галасоў, для рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты, снабжэння выбаршчыкаў выбарчымі бюлетэнямі і ў мэтах забеспячэння няўхільнага выканання ў ходзе выбараў Выбарчага закона, прапануецца стварыць выбарчыя камісіі: Цэнтральную, Выбарчыя камісіі саюзных і аўтаномных рэспублік, аўтаномных абласцей і нацыянальных округ па выбарах у Совет Нацыянальнасцей, Акруговыя па выбарах у Совет Саюза, Акруговыя па выбарах у Совет Нацыянальнасцей і Ўчастковыя выбарчыя камісіі.

Каб забяспечыць сапраўдны народны кантроль за правядзеннем выбараў і ў асаблівасці за падлікам галасоў і выключыць усякую магчымасць злоўжываванняў, праект прапануе складаць усе выбарчыя камісіі, пачынаючы ад Цэнтральнай выбарчай камісіі і канчаючы Ўчастковымі, з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных з зацвярджэння адпаведнага Совета дэпутатаў працоўных. Такім чынам, праект прапануе адмовіцца ад выбарчых камісій, назначаемых Советамі. Замест прыцыпа назначэння праект прапануе ўвесці прынцып прадстаўніцтва ад грамадскіх арганізацый і тазарыстваў працоўных.

Функцыі выбарчых камісій, як відаць з папярэдняга, абмежаваны толькі задачамі, якія выпякаюць з неабходнасці забяспечыць няўхільнае выкананне Выбарчага закона ў ходзе выбараў: зарэгістраваць кандыдатаў, разаслаць выбарчыя бюлетэні, падлічыць галасы і сачыць за выкананнем Выбарчага закона. Ніякіх іншых функцый на выбарчыя камісіі не ўскладаецца і ніякіх іншых праў ім не прадастаўляецца.

І ў гэтай частцы распераза ўшыяся хлусы з афіцыёза германскай фашысткай партыі ашукваюць сэаіх чытачоў. Яны пішуць у тым-жа нумары «Фелькішэр беабахтэр» ад 3-га ліпеня, нібыта афіцыяльным выбарчым камісіям прадастаўлена права адхіляць без асобых труднасцей выбарчыя прапановы пярвічных арганізацый.

Я не буду затрудняць вас абвяржэннем гэтай хлусні. Паны фашысты нават не ўказваюць, з якога артыкула вычыталі яны сваё паведамленне — і гэта не выпадкова, бо яны вынайшлі неіснуючы артыкул у Выбарчым законе. Да падобных метадаў звяртаюцца людзі не ад добрага жыцця, відаць, хлусня ёсць умова для іх існавання.

Не адстаюць ад германскіх фашыстаў і іх польскія лакеі: газета «Ілюстрованы кур'ер подзенны» у паведамленні ад 4 ліпеня з Масквы, а на справе, відаць, з Берліна, паведамляе, што праект Выбарчага закона нібыта дае ўрадавай выбарчай камісіі «права змяняць кандыдацкія спісы арганізацый». Што-ж — гэта нас не здзіўляе! Відаць, польскае фашысцкае яблычка ад германскай яблыні недалёка падае! (Апладысменты, смех).

Каб ні адна скарга на тыя ці іншыя няправільнасці не выслізнула ад грамадскага кантролю, наш праект выбарчага закона ўстанаўлівае цвёрды парадак разгляду рознага роду скарг.

Ад участковай выбарчай камісіі патрабуецца ўключэнне ў пратакол галасавання кароткага выкладу заяў і скарг, паданых на Ўчастковую выбарчую камісію і прынятых Ўчастковай выбарчай камісіяй рашэнняў (арт. 93). Такое-ж патрабаванне прад'яўляецца да Акруговай выбарчай камісіі (арт. 102).

На Цэнтральную выбарчую камісію ўскладаецца разгляд скарг на няправільныя дзеянні Выбарчых камісій і вынясенне па скаргах канчатковых рашэнняў.

Некаторыя фармальнасці пры вызначэнні вынікаў выбараў, увезеныя раздзелам VIII праекта Выбарчага закона, могуць здацца некаторым таварышам залішнімі і нават бюракратычнымі, але там, дзе пытанне ідзе аб стварэнні вышэйшага дзяржаўнага органа, неабходна найвялікшая дасканаласць, тут ніякая фармальнасць не будзе залішняй, калі яна стварае дадатковую гарантыю дакладнага выканання Канстытуцыі і Выбарчага закона: выбарчыя бюлетэні, якія ўключаюць усіх выстаўленых па дэнай акрузе грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі працоўных кандыдатаў у дэпутаты, вылаўпца выбаршчыкам у памяшканні Ўчастковай выбарчай камісіі (арт. 78); на кожнага кандыдата ў дэпутаты вялецца падліковы ліст у двух экземплярах сакратаром камісіі і ўнаўнаважаным на тое членам Участковай выбарчай камісіі (арт. 89); Участковая выбарчая камісія пасылае ў Акруговую выбарчую камісію не толькі пратакол галасавання, але і абодва экземпляры падліковых лістоў на кожнага кандыдата (арт. 95); Совет дэпутатаў працоўных абавязан хаваць выбарчыя бюлетэні аж да зацвярджэння мандатаў Вярхоўным Советам СССР (арт. 97) і т. д.

Задачу забяспечыць правільнасць падліку галасоў праследуе прадугледжваемая праектам публічнасць падліку галасоў. Гэта публічнасць дасягаецца ўжо самім складам выбарчых камісій, якія арганізуюцца не з асоб, назначаных органамі ўлады, а з асоб, высунутых грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі працоўных. Праект Выбарчага закона, аднак, не абмежоўваецца гэтым і прадугледжвае права прысутнасці пры падліку галасоў у памяшканнях як Участковай выбарчай камісіі, так і Акруговай выбарчай камісіі, спецыяльна на тое ўпаўнаважаных прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных, а таксама прадстаўнікоў друку (арт. 85 і 99).

Мэта — забяспечыць дакладнае волевыяўленне працоўных — праследуе прапануемая праектам Выбарчага закона правіла, згодна якому выбраным лічыцца толькі кандыдат, які атрымаў абсалютную большасць галасоў, — калі ні адзін з кандыдатаў на выбарах не атрымаў абсалютнай большасці галасоў, то абавязкова (не пазней, чым у двухтыднёвы тэрмін) перабалатыроўка двух кандыдатаў, якія атрымалі найбольшую колькасць галасоў (арт. 107).

Тую-ж мэту — забяспечыць дакладнае волевыяўленне працоўных—праследуе правіла, згодна якому ў тых выбарчых акругах, дзе паданая колькасць галасоў па выбарчай акрузе складае менш паловы выбаршчыкаў, выбары абвяшчаюцца несапраўднымі і праводзяцца новыя выбары.

Нарэшце, праект прапануе ўстанавіць найстражэйшае пакаранне для ўсіх, хто прабуе парушыць на выбарах Канстытуцыю СССР ці «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР».

Я канчаю характарыстыку выбарчага закона. Я думаю, што вы згодзіцеся з тым, што асноўнай асаблівасцю праекта Выбарчага закона, у поўнай адпаведнасці з характарам сталінскай Канстытуцыі, з'яўляецца «яго паслядоўны і да канца вытрыманы дэмакратызм». (Сталін). (Апладысменты).

Совецкі выбарчы закон не толькі прадастаўляе выбарчыя правы грамадзянам, але і стварае ўсе неабходныя ўмовы для таго, каб яны маглі ажыццявіць гэтыя правы на справе і прыняць актыўны ўдзел у выбарах.

Выбарчы закон скарыстоўвае ўсё лепшае, што стварылі ў гэтай галіне буржуазна-дэмакратычныя краіны, і разам з тым, ператвараючы фармальныя правы грамадзян у правы сапраўдныя, у правы гарантаваныя, робіць велізарны крок наперад у адпаведнасці з умовамі сацыялістычнай дэмакратыі, якая змяняе дэмакратыю буржуазную. (Апладысменты).

IV.

Аб недахопах у рабоце советаў

Таварышы, нашы Советы з'яўляюцца формай дзяржаўнага кіравання непараўнана больш высокай і перадавой, чым любая найбольш дэмакратычная буржуазная форма кіравання. Народныя масы любяць і паважаюць Советы, як органы сваёй народнай улады. Праз Советы ажыццяўляецца рабоча-сялянскі саюз, праз Советы рабочы клас ажыццяўляе кіраўніцтва сялянствам, праз Советы працоўныя прымаюць удзел у кіраванні краінай, у сацыялістычным будаўніцтве. У Советах і праз Советы ажыццяўляецца бесперапынная, гібкая і моцная сувязь беспартыйных з комуністамі. Советы пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі пабудавалі сацыялістычнае грамадства, ператварылі адсталую Расію ў магутную дзяржаву, адстаялі, наперакор проіскам імперыялістаў усяго свету і іх трацкісцка-бухарынскіх агентаў і шпіёнаў, незалежнасць краіны.

Аднак, з гэтага ні ў якім разе не выпякае, што ў нас няма ўстаноў, якія працуюць дрэнна, — у нас іх нямала; з гэтага не выцякае, што ў нас няма Советаў дэпутатаў працоўных, дрэнна выконваючых свае абавязкі, — у нас іх нямала, з гэтага не выпякае, што ў нас няма людзей, якія дрэнна працуюць, адарваліся ад мас, забюракраціліся, — у нас іх, нажаль, таксама нямала. Значыць, і гэта няўхільна ўкараняе ў нашу свядомасць тыя людзей, якія не лічаць сваім абавязкам выконваць рашэнні партыі і ўрада і разбураюць, такім чынам, асновы партыйнай і дзяржаўнай дысцыпліны.

Несумненна, што на выбарах недахопы ў рабоце советаў тых ці іншых кандыдатаў, тых ці іншых устаноў будуць узяты пад суровую крытыку.

Задача састаіць у тым, каб зразумець недахопы ў рабоце нашых Советаў, усвядоміць іх і падняць на выбарах масы на іх знішчэнне.

Задача састаіць у тым, каб народ правяраў кандыдатаў у дэпутаты, каб ў вышэйшы орган нашай улады — Вярхоўны Совет СССР прайшлі толькі людзі, адданыя справе сацыялізма, адданыя справе партыі Леніна—Сталіна, каб у советы не прайшоў ні адзін з замаскаваўшыхся ворагаў народу.

Злавіць ворагаў рабочага класа і сялянства нельга, дзейнічаючы толькі зверху, толькі аднымі вачамі комуністаў, кіруючых тымі ці іншымі органамі, — ворагаў трэба лавіць і знізу і зверху, бо комуністы, якія кіруюць тымі ці іншымі органамі, усяго ўбачыць не могуць. Злавіць і раздавіць ворагаў советаў, ворагаў рабочых і сялян можна толькі разгарнуўшы дэмакратыю ва ўсю, як гэтага патрабуе партыя, як гэтага патрабуе таварыш Сталін, як гэта патрабуе сталінская Канстытуцыя. (Апладысменты).

У сувязі з гэтым дазвольце напомніць словы таварыша Сталіна ў гутарцы з Рой Говардам:

«... выбарчая барацьба будзе ажыўленай, яна будзе працякаць наўкол мноства вастрэйшых пытанняў, — галоўным чынам пытанняў практычных, якія маюць першаступеннае значэнне для народу. Наша новая выбарчая сістэма палягне ўсе ўстановы і арганізацыі, прымусіць іх палепшыць сваю работу. Усеагульныя, роўныя, прамыя і тайныя выбары ў СССР будуць біэуном у руках насельніцтва супроць дрэнна працуючых органаў улады».

Так сказаў таварыш Сталін. Гэта значыць, што выбары будуць суровай праверкай, суровым экзаменам для совецкіх работнікаў — хто яго не вытрымае — паляціць — і па заслугах.

V.

Аб вылучэнні новых кадраў

Пераходжу да пытання, якое мае асабліва істотнае значэнне з пункту гледжання наяўнаходзячых выбараў у Советы — да пытання аб падборы кадраў у Советах. Советы з'яўляюцца арганізацыямі, праз якія мільёны людзей узнімаюцца да кіравання. Несумненна, што ў галіне вылучэння новых кадраў праз Советы можна, аднак, зрабіць яшчэ больш.

Нярэдка маюць месца факты досыць добра вядомыя, калі груба парушаецца важнейшая ўмова ўмацавання Советаў, а іменна: бесперапыннае папаўненне Советаў і іх выканаўчых органаў новымі маладымі сіламі, якія вырастаюць у рабочым класе і сялянстве.

На жаль, практыка недастатковага вылучэння маладых растучых сіл мае месца і ў такіх советах, дзе на чале стаяць найлепшыя работнікі. У такіх выпадках гэта практыка выклікаецца зусім неабгрунтаванай боязню новых людзей. Многія з таварышоў, якія недастаткова вылучаюць новыя сілы, апраўдваюцца тым, што быццам-бы няма кадраў, а на справе яны проста часта баяцца: як-бы гэтыя канова вылучаныя людзі не аказаліся лепшымі работнікамі, чым яны самі.

Тое, што гаварыў нам таварыш Сталін на Пленуме Цэнтральнага Камітэта партыі, — калі-б мы займаліся вылучэннем людзей, то быў-бы лішак кадраў—больш за ўсё, я думаю, адносіцца іменна да Советаў!

Сярод работнікаў фабрык, заводаў, транспарта, соўгасаў, калгасаў, МТС, нашых совецкіх устаноў ёсць сотні і тысячы людзей, якія даўно перараслі тую работу, якую яны робяць, — трэба толькі пазвучыць іх і дапамагчы ім, і мы атрымаем сапраўдных работнікаў, неабходных Советам, людзей, здольных абараніць інтарэсы рабочага класа і сялянства супроць любога ворага працоўных, людзей дзелавых, якія ўмеюць і жадаюць працаваць, а не балбатаць, людзей, адданых справе сацыялізма і інтарэсам працоўных — як комуністаў, так і беспартыйных.

Далей, аб беспартыйных. У той час, як мільёны беспартыйных рабочых, сялян, інтэлігентаў сталі сапраўднымі непартыйнымі большавікамі, аб якіх гаварыў таварыш Сталін, лік беспартыйных у складзе выканкомаў і, асабліва ў складзе кіраўнікоў аддзелаў і іх намеснікаў, — зусім недастатковы. Ёсць кіраўнікі Совetаў, якія ганарацца, як «дасягненнем», тым, што ў іх усе кіраўнікі аддзелаў і іх намеснікі — члены партыі. Ці трэба даказваць, што пагарлівыя адносіны да беспартыйных і запіранне беспартыйных пярэчыць традыцыям і палітыцы ленінска-сталінскай большавіцкай партыі. Ці трэба даказваць, што на чале многіх земельных органаў і органаў народнай асветы, напрыклад, лепш было-б мець часных і вопытных беспартыйных, чым людзей, якія сядзяць на гэтых пастах, адзінай вартасцю якіх нярэдка з'яўляецца толькі тое, што ў іх ёсць партыйны білет.

Далей, аб жанчынах. У той час, як мільёны жанчын у СССР даюць узоры адданасці справе рабочага класа і калгаснага сялянства, узоры свядомасці, асабістай чэснасці і здольнасці быць кіраўнікамі, роля жанчыны ў Советах, і асабліва ў выканкомах, у рэзультаце бюракратычных скажэнняў у апараце недастаткова расце. Вядома, жанчын у нашых советах у сто раз больш, чым у буржуазных парламентах, аднак гэтага недастаткова.

Характэрна, між іншым, што ў складзе дэпутатаў советаў чвэрць усяго склаву дэпутатаў советаў складаюць жанчыны, але ў складзе старшынь РВК жанчын толькі 2%, у складзе старшынь горсоветаў — 6%, у складзе старшынь сельсоветаў — 6%; ні адной замаі жанчыны не выбрана ў якасці старшыні ці намесніка старшыні край (абл.) выканкома.

Трэба сказаць, што і Масква тут не служыць асабліва добрым прыкладам. У складзе Маскоўскага Совета 578 жанчын, а сярод кіраўнікоў аддзелаў і прэзідыума совета толькі 2 жанчыны. У 23 раённых советах Масквы няма ні адной жанчыны старшыні совета і толькі адна — нам. старшыні совета.

Падобная практыка недаацэнкі жанчыны нічога агульнага не мае з праграмай ленінска-сталінскай партыі, якая ў вызваленай сацыялізмам жанчыне бачыць велізарную крыніцу сіл для ўмацавання і паляпшэння работы Советаў. Варта ўспомніць любую з калгасных нарад, што праходзілі тут у Крэмлі, у гэтай зале, каб не шукаць іншых доказаў наяўнасці велізарных рэзерваў, якія вырасціла наша краіна ў асобе жанчын. (Апладысменты).

Я не гавару ўжо аб комсамольцах, сярод якіх сотні тысяч людзей дасягнулі немалога ўзросту, маюць немалы вопыт арганізацыйнай і палітычнай работы. Сотні і тысячы комсамольцаў могуць узняць сур'ёзную кіруючую работу ў Советах.

Неабходна смялей вылучаць беспартыйных, комсамольцаў і жанчын на пасты членаў Советаў, выканкомаў Советаў і кіраўнікоў аддзеламі, памятаючы неаднаразовыя ўказанні Леніна і Сталіна аб тым, што не паяўнасць партыйнага білета, а тым больш не прыналежнасць да мужчынскага полу робіць чалавека вартым займаць той ці іншы пост, а толькі сапраўдная адданасць справе сацыялізма і дзелавыя якасці.

Каб гэта справа вышла, каб не атрымалася быстрага расчаравання, — трэба толькі адно — дапамагчы гэтым людзям вучыцца. Трэба сказаць, што з навучаннем совецкіх кадраў справа абстаіць не важна. Ёсць велізарная колькасць курсаў совецкіх работнікаў, але яны вучаць не старшынь сельсоветаў і старшынь РВК, а людзей, часта вызваленых з совецкай работы за непрыгоднасць, і, апрача таго, яны вучаць у большасці не таму, чаму трэба, толькі мізэрную частку часу прысвячаючы вывучэнню Канстытуцыі і арганізацыі совецкай работы.

Задача тут састаіць у тым, каб вучыць іменна кіраўнікоў советаў і дапамагаць ім расці.

***

Я заканчваю. Прадстаўляемы на ваша разгледжанне праект Выбарчага закона лае найбольш сапраўдныя гарантыі ажыццяўлення ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

У гэтых гарантыях яшчэ раз праяўляецца сутнасць пролетарскай дэмакратыі, якая, як указваў таварыш Сталін, заключаецца ў тым, што пролетарская дэмакратыя ў адрозненне ад буржуазнай не абмяжоўваецца толькі фіксаваннем фармальных праў грамадзян, а клапоціцца «аб умовах ажыццяўлення гэтых праў, аб магчымасці іх ажыццяўлення, аб сродках іх ажыццяўлення».

(Працяг на 4 стар.).

*) Прапяг. Пачатак даклада т. Якаўлева аб праекце «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» гл. у «Звяздзе» за 8 ліпеня.

Для вайсковых часцей і вайсковых злучэнняў праект прадугледжвае арганізацыю выбарчых участкаў з колькасцю не менш 50 і не больш 1.500 выбаршчыкаў. Такім чынам, будзе дадзена магчымасць прыняць удзел у выбарах самым дробным вайсковым часцям, якія ахоўваюць рубяжы СССР. Асобы, якія знаходзяцца ў арміі, але не ўваходзяць у вайсковыя часці ці вайсковыя злучэнні, як, напрыклад, работнікі Наркамата Абароны, згодна гэтаму праекту, будуць прымаць удзел у галасаванні нараўне з астатнімі грамадзянамі СССР па месцу сэайго жыхарства.

Выбары будуць адбывацца ў адзін з нерабочых дзён з 6 гадзін раніцы да 12 гадзін ночы. Як відаць, прыдзецца выбраць адну з нядзель, як нерабочы дзень у вёсцы. Пажадана пры гэтым выбраць тую нядзелю, з якою супадаў-бы выходны дзень у горадзе.

Для падліку галасоў, для рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты, снабжэння выбаршчыкаў выбарчымі бюлетэнямі і ў мэтах забеспячэння няўхільнага выканання ў ходзе выбараў Выбарчага закона, прапануецца стварыць выбарчыя камісіі: Цэнтральную, Выбарчыя камісіі саюзных і аўтаномных рэспублік, аўтаномных абласцей і нацыянальных округ па выбарах у Совет Нацыянальнасцей, Акруговыя па выбарах у Совет Саюза, Акруговыя па выбарах у Совет Нацыянальнасцей і Ўчастковыя выбарчыя камісіі.

Каб забяспечыць сапраўдны народны кантроль за правядзеннем выбараў і ў асаблівасці за падлікам галасоў і выключыць усякую магчымасць злоўжываванняў, праект прапануе складаць усе выбарчыя камісіі, пачынаючы ад Цэнтральнай выбарчай камісіі і канчаючы Ўчастковымі, з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных з зацвярджэння адпаведнага Совета дэпутатаў працоўных. Такім чынам, праект прапануе адмовіцца ад выбарчых камісій, назначаемых Советамі. Замест прыцыпа назначэння праект прапануе ўвесці прынцып прадстаўніцтва ад грамадскіх арганізацый і тазарыстваў працоўных.

Функцыі выбарчых камісій, як відаць з папярэдняга, абмежаваны толькі задачамі, якія выпякаюць з неабходнасці забяспечыць няўхільнае выкананне Выбарчага закона ў ходзе выбараў: зарэгістраваць кандыдатаў, разаслаць выбарчыя бюлетэні, падлічыць галасы і сачыць за выкананнем Выбарчага закона. Ніякіх іншых функцый на выбарчыя камісіі не ўскладаецца і ніякіх іншых праў ім не прадастаўляецца.

І ў гэтай частцы распераза ўшыяся хлусы з афіцыёза германскай фашысткай партыі ашукваюць сэаіх чытачоў. Яны пішуць у тым-жа нумары «Фелькішэр беабахтэр» ад 3-га ліпеня, нібыта афіцыяльным выбарчым камісіям прадастаўлена права адхіляць без асобых труднасцей выбарчыя прапановы пярвічных арганізацый.

Я не буду затрудняць вас абвяржэннем гэтай хлусні. Паны фашысты нават не ўказваюць, з якога артыкула вычыталі яны сваё паведамленне — і гэта не выпадкова, бо яны вынайшлі неіснуючы артыкул у Выбарчым законе. Да падобных метадаў звяртаюцца людзі не ад добрага жыцця, відаць, хлусня ёсць умова для іх існавання.

Не адстаюць ад германскіх фашыстаў і іх польскія лакеі: газета «Ілюстрованы кур'ер подзенны» у паведамленні ад 4 ліпеня з Масквы, а на справе, відаць, з Берліна, паведамляе, што праект Выбарчага закона нібыта дае ўрадавай выбарчай камісіі «права змяняць кандыдацкія спісы арганізацый». Што-ж — гэта нас не здзіўляе! Відаць, польскае фашысцкае яблычка ад германскай яблыні недалёка падае! (Апладысменты, смех).

Каб ні адна скарга на тыя ці іншыя няправільнасці не выслізнула ад грамадскага кантролю, наш праект выбарчага закона ўстанаўлівае цвёрды парадак разгляду рознага роду скарг.

Ад участковай выбарчай камісіі патрабуецца ўключэнне ў пратакол галасавання кароткага выкладу заяў і скарг, паданых на Ўчастковую выбарчую камісію і прынятых Ўчастковай выбарчай камісіяй рашэнняў (арт. 93). Такое-ж патрабаванне прад'яўляецца да Акруговай выбарчай камісіі (арт. 102).

На Цэнтральную выбарчую камісію ўскладаецца разгляд скарг на няправільныя дзеянні Выбарчых камісій і вынясенне па скаргах канчатковых рашэнняў.

Некаторыя фармальнасці пры вызначэнні вынікаў выбараў, увезеныя раздзелам VIII праекта Выбарчага закона, могуць здацца некаторым таварышам залішнімі і нават бюракратычнымі, але там, дзе пытанне ідзе аб стварэнні вышэйшага дзяржаўнага органа, неабходна найвялікшая дасканаласць, тут ніякая фармальнасць не будзе залішняй, калі яна стварае дадатковую гарантыю дакладнага выканання Канстытуцыі і Выбарчага закона: выбарчыя бюлетэні, якія ўключаюць усіх выстаўленых па дэнай акрузе грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі працоўных кандыдатаў у дэпутаты, вылаўпца выбаршчыкам у памяшканні Ўчастковай выбарчай камісіі (арт. 78); на кожнага кандыдата ў дэпутаты вялецца падліковы ліст у двух экземплярах сакратаром камісіі і ўнаўнаважаным на тое членам Участковай выбарчай камісіі (арт. 89); Участковая выбарчая камісія пасылае ў Акруговую выбарчую камісію не толькі пратакол галасавання, але і абодва экземпляры падліковых лістоў на кожнага кандыдата (арт. 95); Совет дэпутатаў працоўных абавязан хаваць выбарчыя бюлетэні аж да зацвярджэння мандатаў Вярхоўным Советам СССР (арт. 97) і т. д.

Задачу забяспечыць правільнасць падліку галасоў праследуе прадугледжваемая праектам публічнасць падліку галасоў. Гэта публічнасць дасягаецца ўжо самім складам выбарчых камісій, якія арганізуюцца не з асоб, назначаных органамі ўлады, а з асоб, высунутых грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі працоўных. Праект Выбарчага закона, аднак, не абмежоўваецца гэтым і прадугледжвае права прысутнасці пры падліку галасоў у памяшканнях як Участковай выбарчай камісіі, так і Акруговай выбарчай камісіі, спецыяльна на тое ўпаўнаважаных прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных, а таксама прадстаўнікоў друку (арт. 85 і 99).

Мэта — забяспечыць дакладнае волевыяўленне працоўных — праследуе прапануемая праектам Выбарчага закона правіла, згодна якому выбраным лічыцца толькі кандыдат, які атрымаў абсалютную большасць галасоў, — калі ні адзін з кандыдатаў на выбарах не атрымаў абсалютнай большасці галасоў, то абавязкова (не пазней, чым у двухтыднёвы тэрмін) перабалатыроўка двух кандыдатаў, якія атрымалі найбольшую колькасць галасоў (арт. 107).

Тую-ж мэту — забяспечыць дакладнае волевыяўленне працоўных—праследуе правіла, згодна якому ў тых выбарчых акругах, дзе паданая колькасць галасоў па выбарчай акрузе складае менш паловы выбаршчыкаў, выбары абвяшчаюцца несапраўднымі і праводзяцца новыя выбары.

Нарэшце, праект прапануе ўстанавіць найстражэйшае пакаранне для ўсіх, хто прабуе парушыць на выбарах Канстытуцыю СССР ці «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР».

Я канчаю характарыстыку выбарчага закона. Я думаю, што вы згодзіцеся з тым, што асноўнай асаблівасцю праекта Выбарчага закона, у поўнай адпаведнасці з характарам сталінскай Канстытуцыі, з'яўляецца «яго паслядоўны і да канца вытрыманы дэмакратызм». (Сталін). (Апладысменты).

Совецкі выбарчы закон не толькі прадастаўляе выбарчыя правы грамадзянам, але і стварае ўсе неабходныя ўмовы для таго, каб яны маглі ажыццявіць гэтыя правы на справе і прыняць актыўны ўдзел у выбарах.

Выбарчы закон скарыстоўвае ўсё лепшае, што стварылі ў гэтай галіне буржуазна-дэмакратычныя краіны, і разам з тым, ператвараючы фармальныя правы грамадзян у правы сапраўдныя, у правы гарантаваныя, робіць велізарны крок наперад у адпаведнасці з умовамі сацыялістычнай дэмакратыі, якая змяняе дэмакратыю буржуазную. (Апладысменты).

IV.

Аб недахопах у рабоце советаў

Таварышы, нашы Советы з'яўляюцца формай дзяржаўнага кіравання непараўнана больш высокай і перадавой, чым любая найбольш дэмакратычная буржуазная форма кіравання. Народныя масы любяць і паважаюць Советы, як органы сваёй народнай улады. Праз Советы ажыццяўляецца рабоча-сялянскі саюз, праз Советы рабочы клас ажыццяўляе кіраўніцтва сялянствам, праз Советы працоўныя прымаюць удзел у кіраванні краінай, у сацыялістычным будаўніцтве. У Советах і праз Советы ажыццяўляецца бесперапынная, гібкая і моцная сувязь беспартыйных з комуністамі. Советы пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі пабудавалі сацыялістычнае грамадства, ператварылі адсталую Расію ў магутную дзяржаву, адстаялі, наперакор проіскам імперыялістаў усяго свету і іх трацкісцка-бухарынскіх агентаў і шпіёнаў, незалежнасць краіны.

Аднак, з гэтага ні ў якім разе не выпякае, што ў нас няма ўстаноў, якія працуюць дрэнна, — у нас іх нямала; з гэтага не выцякае, што ў нас няма Советаў дэпутатаў працоўных, дрэнна выконваючых свае абавязкі, — у нас іх нямала, з гэтага не выпякае, што ў нас няма людзей, якія дрэнна працуюць, адарваліся ад мас, забюракраціліся, — у нас іх, нажаль, таксама нямала. Значыць, і гэта няўхільна ўкараняе ў нашу свядомасць тыя людзей, якія не лічаць сваім абавязкам выконваць рашэнні партыі і ўрада і разбураюць, такім чынам, асновы партыйнай і дзяржаўнай дысцыпліны.

Несумненна, што на выбарах недахопы ў рабоце советаў тых ці іншых кандыдатаў, тых ці іншых устаноў будуць узяты пад суровую крытыку.

Задача састаіць у тым, каб зразумець недахопы ў рабоце нашых Советаў, усвядоміць іх і падняць на выбарах масы на іх знішчэнне.

Задача састаіць у тым, каб народ правяраў кандыдатаў у дэпутаты, каб ў вышэйшы орган нашай улады — Вярхоўны Совет СССР прайшлі толькі людзі, адданыя справе сацыялізма, адданыя справе партыі Леніна—Сталіна, каб у советы не прайшоў ні адзін з замаскаваўшыхся ворагаў народу.

Злавіць ворагаў рабочага класа і сялянства нельга, дзейнічаючы толькі зверху, толькі аднымі вачамі комуністаў, кіруючых тымі ці іншымі органамі, — ворагаў трэба лавіць і знізу і зверху, бо комуністы, якія кіруюць тымі ці іншымі органамі, усяго ўбачыць не могуць. Злавіць і раздавіць ворагаў советаў, ворагаў рабочых і сялян можна толькі разгарнуўшы дэмакратыю ва ўсю, як гэтага патрабуе партыя, як гэтага патрабуе таварыш Сталін, як гэта патрабуе сталінская Канстытуцыя. (Апладысменты).

У сувязі з гэтым дазвольце напомніць словы таварыша Сталіна ў гутарцы з Рой Говардам:

«... выбарчая барацьба будзе ажыўленай, яна будзе працякаць наўкол мноства вастрэйшых пытанняў, — галоўным чынам пытанняў практычных, якія маюць першаступеннае значэнне для народу. Наша новая выбарчая сістэма палягне ўсе ўстановы і арганізацыі, прымусіць іх палепшыць сваю работу. Усеагульныя, роўныя, прамыя і тайныя выбары ў СССР будуць біэуном у руках насельніцтва супроць дрэнна працуючых органаў улады».

Так сказаў таварыш Сталін. Гэта значыць, што выбары будуць суровай праверкай, суровым экзаменам для совецкіх работнікаў — хто яго не вытрымае — паляціць — і па заслугах.

V.

Аб вылучэнні новых кадраў

Пераходжу да пытання, якое мае асабліва істотнае значэнне з пункту гледжання наяўнаходзячых выбараў у Советы — да пытання аб падборы кадраў у Советах. Советы з'яўляюцца арганізацыямі, праз якія мільёны людзей узнімаюцца да кіравання. Несумненна, што ў галіне вылучэння новых кадраў праз Советы можна, аднак, зрабіць яшчэ больш.

Нярэдка маюць месца факты досыць добра вядомыя, калі груба парушаецца важнейшая ўмова ўмацавання Советаў, а іменна: бесперапыннае папаўненне Советаў і іх выканаўчых органаў новымі маладымі сіламі, якія вырастаюць у рабочым класе і сялянстве.

На жаль, практыка недастатковага вылучэння маладых растучых сіл мае месца і ў такіх советах, дзе на чале стаяць найлепшыя работнікі. У такіх выпадках гэта практыка выклікаецца зусім неабгрунтаванай боязню новых людзей. Многія з таварышоў, якія недастаткова вылучаюць новыя сілы, апраўдваюцца тым, што быццам-бы няма кадраў, а на справе яны проста часта баяцца: як-бы гэтыя канова вылучаныя людзі не аказаліся лепшымі работнікамі, чым яны самі.

Тое, што гаварыў нам таварыш Сталін на Пленуме Цэнтральнага Камітэта партыі, — калі-б мы займаліся вылучэннем людзей, то быў-бы лішак кадраў—больш за ўсё, я думаю, адносіцца іменна да Советаў!

Сярод работнікаў фабрык, заводаў, транспарта, соўгасаў, калгасаў, МТС, нашых совецкіх устаноў ёсць сотні і тысячы людзей, якія даўно перараслі тую работу, якую яны робяць, — трэба толькі пазвучыць іх і дапамагчы ім, і мы атрымаем сапраўдных работнікаў, неабходных Советам, людзей, здольных абараніць інтарэсы рабочага класа і сялянства супроць любога ворага працоўных, людзей дзелавых, якія ўмеюць і жадаюць працаваць, а не балбатаць, людзей, адданых справе сацыялізма і інтарэсам працоўных — як комуністаў, так і беспартыйных.

Далей, аб беспартыйных. У той час, як мільёны беспартыйных рабочых, сялян, інтэлігентаў сталі сапраўднымі непартыйнымі большавікамі, аб якіх гаварыў таварыш Сталін, лік беспартыйных у складзе выканкомаў і, асабліва ў складзе кіраўнікоў аддзелаў і іх намеснікаў, — зусім недастатковы. Ёсць кіраўнікі Совetаў, якія ганарацца, як «дасягненнем», тым, што ў іх усе кіраўнікі аддзелаў і іх намеснікі — члены партыі. Ці трэба даказваць, што пагарлівыя адносіны да беспартыйных і запіранне беспартыйных пярэчыць традыцыям і палітыцы ленінска-сталінскай большавіцкай партыі. Ці трэба даказваць, што на чале многіх земельных органаў і органаў народнай асветы, напрыклад, лепш было-б мець часных і вопытных беспартыйных, чым людзей, якія сядзяць на гэтых пастах, адзінай вартасцю якіх нярэдка з'яўляецца толькі тое, што ў іх ёсць партыйны білет.

Далей, аб жанчынах. У той час, як мільёны жанчын у СССР даюць узоры адданасці справе рабочага класа і калгаснага сялянства, узоры свядомасці, асабістай чэснасці і здольнасці быць кіраўнікамі, роля жанчыны ў Советах, і асабліва ў выканкомах, у рэзультаце бюракратычных скажэнняў у апараце недастаткова расце. Вядома, жанчын у нашых советах у сто раз больш, чым у буржуазных парламентах, аднак гэтага недастаткова.

Характэрна, між іншым, што ў складзе дэпутатаў советаў чвэрць усяго склаву дэпутатаў советаў складаюць жанчыны, але ў складзе старшынь РВК жанчын толькі 2%, у складзе старшынь горсоветаў — 6%, у складзе старшынь сельсоветаў — 6%; ні адной замаі жанчыны не выбрана ў якасці старшыні ці намесніка старшыні край (абл.) выканкома.

Трэба сказаць, што і Масква тут не служыць асабліва добрым прыкладам. У складзе Маскоўскага Совета 578 жанчын, а сярод кіраўнікоў аддзелаў і прэзідыума совета толькі 2 жанчыны. У 23 раённых советах Масквы няма ні адной жанчыны старшыні совета і толькі адна — нам. старшыні совета.

Падобная практыка недаацэнкі жанчыны нічога агульнага не мае з праграмай ленінска-сталінскай партыі, якая ў вызваленай сацыялізмам жанчыне бачыць велізарную крыніцу сіл для ўмацавання і паляпшэння работы Советаў. Вар

ІНСТЫТУТ АГРАГЛЕБАЗНАЎСТВА ТРЭБА АЗДАРАВІЦЬ

Не так даўно ў Інстытуце аграглебазнаўства і ўгнаенняў Акадэміі навук Беларусі была сарвана маска з нацыянал-фашыста Пратасені, які ўзначальваў у інстытуце ўсю даследчую работу па ліквідацыі хімізацыі. Разам з ворагамі народа Ганчарыкам, Смолічам, Гарэцкім і інш. ён прыклаў свае брудныя рукі да навуково-даследчай работы па сельскай гаспадарцы.

Тут было праведзена своеасаблівае размеркаванне роляў.

Шпіён Бенек са сваёй аграляй у зямельных органах праводзіў шкодніцтва ў практыцы сельскай гаспадаркі, накіраванае на падрыў калгаснага ладу, а Пратасеня і К° пад шкодніцтва фашысцкіх бандытаў з Наркамзема падводзілі «тэарэтычныя» ўгрунтаванні.

Няма ніякай неабходнасці ў гэтым артыкуле падвяргаць падрабязнаму разгляду ўсю «прадукцыю» гэтага нацыянал-фашыста. Зусім ясна, што, звязаны ў сваёй дзейнасці з трацкістамі Сігаркіным і Дзікусарам, якія знаходзіліся ў кіраўніцтве Усесаюзнага інстытута ўгнаенняў, аграглебазнаўства і агратэхнікі, а таксама з ворагамі народу, пралезшымі ў даследчыя сельскагаспадарчыя ўстановы і органы Наркамзема БССР, — Пратасеня на працягу ряду год шкодзіў ў галіне хімізацыі сельскай гаспадаркі.

Лінія гэтага спрактыкаванага шкодніка, зусім відавочна, была разлічана на кампраметацыю мінеральных угнаенняў, мясцовых угнаенняў, у прыватнасці, торфу, на зрыў агратэхнічных мерапрыемстваў, каб знізіць ураджайнасць калгасна-саўгасных палёў.

Невядома, дакуль-бы ў затхлай абстаноўцы злачыннай дабрадушнасці і самасупакоенасці магла прадаўжацца дзейнасць Пратасені ў Інстытуце аграглебазнаўства, каб ён не быў выкрыт, дарэчы, паміма партыйнай арганізацыі Акадэміі навук.

Ці былі сігналы аб Пратасені? Былі. Яшчэ ў часе чысткі партыі ў 1933 годзе Пратасеня быў выкрыт і выключан як чужы чалавек, буржуазны перараджэнец. Але праз некаторы час па халайніцтву партыйнай групы Інстытута, за подпісам Чэтверыкова, Антоненкі, трацкіста Пупышскага і выкрытага зараз як двурушніка Магарама, Пратасеня быў адноўлен у партыі.

Перад усімі работнікамі Інстытута аграглебазнаўства ў першую чаргу, а тым больш перад комуністамі, востра ўстае задача далейшага выкрыцця ўсіх сувязей Пратасені ў Інстытуце, у Акадэміі навук і па-за ёю. Ці робіцца гэта? Далёка не.

Саўтарамі некаторых «навуковых» прац Пратасені былі навуковыя работнікі Рубанаў, Шпілеўскі, Пілько, Уласенка і Чэтверыкоў. Здавалася-б, што яны ў першую чаргу мелі магчымасць і абавязаны былі дапамагчы партыі да канца ўскрыць шкодніцтва, змагацца за найхутчэйшую ліквідацыю яго вынікаў. Гэтага, аднак, не відаць.

На вытворчай нарадзе 4 мая Рубанаў, Пілько, Уласенка, разам з акадэмікам Афанасьевым, гаварылі не аб шкодніцтве ў рабоце Пратасені, а толькі аб недахопах у гэтых «навуковых» працах. А навуковы работнік Уласенка нават прапанаваў перавыдаць шкодніцкую кніжку Пратасені «Эфектыўнасць торфу і тарфяных угнаенняў на падзолістых глебах».

Акадэмік, член ВКП(б) Кедраў-Зіхман, які кіруе пытаннямі хімізацыі глебы ў Аграглебавым інстытуце, да апошняга часу праяўляе падазроную стараннасць у абароне «навуковых» прац Пратасені.

Далёка не ўсё зрабіў па выкрыццю шкодніцтва Пратасені навуковы работнік Чэтверыкоў, які так многа лаваяў гэтаму нацыянал-фашысту, быў сааўтарам адной з яго «прац» і халайнічаў у свой час аб адналенні яго ў партыі.

Такім чынам, у Інстытуце аграглебазнаўства няма рашучага разгортвання крытыкі і самакрытыкі, сур'ёзнай барацьбы па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва.

Карыстаючыся такім становішчам спраў, у інстытуце знаходзяцца зараз людзі, якія з мэтай скрыцця свайго ўласнага твару спяшаюцца пахваліцца пільнасцю і афішыраваць сябе як даўніх праціўнікаў Пратасені. У такую позу зараз стаў прафесар гэтага інстытута Э. Магарам, які з дзіўнай стараннасцю «выкрывае» даўно выкрытага Пратасеню. А вядома-ж, што і Магарам палпісваў хадайніцтва ў свой час аб адналенні Пратасені ў партыі. Магарам-жа пісаў на «працу» Пратасені «Зводка па хімізацыі ў БССР» у лютым 1936 г. рэцэнзію, дзе побач з асцярожнымі заўвагамі аб асобных недахопах адзначае, што «работа мае вялікае тэарэтычнае і навуковае значэнне».

Сэнс гэтых паводзін робіцца больш ясным, калі прыглядзецца да твару самаго Магарама, які раскрываецца толькі ў самыя апошнія дні. З 1915 па 1919 год ён быў эсэрам. У 1923 годзе, будучы студэнтам Тімірязеўскай сельскагаспадарчай акадэміі, актыўна выступаў супроць генеральнай лініі партыі, галасаваў за платформу трацкісцкай апазіцыі. Гэты свой трацкісцкі груз ён старанна ўтойваў ад партыі.

За час работы ў Акадэміі навук Беларусі ён зрабіў некалькі антыпартыйных выступленняў, у якіх ідэалізаваў Іуду-Троцкага. Да апошняга часу Магарам хаваў у сябе «Уроки Октября» і іншыя кнігі фашысцкага бандыта Троцкага. Гэту контрэволюцыйную атруту ён беражліва захоўвае з 1921 года. Відаць, па густу прышлася яна яму. Магарам-жа рэкамендаваў на работу ў Аграглебавы інстытут нейкага Пупышскага, выкрытага потым як трацкіста.

2 ліпеня на сходзе партыйнага калектыва разглядалася справа Магарама. У наскрозь двурушніцкім, дэмагагічным выступленні ён дарэмна імкнуўся абвяргаць неабвержнае і даказаць, што яго... цкуюць. Зноў-жа, аказваецца, за тое, што ён «выкрываў» ворага Пратасеню. Партыйны калектыў Акадэміі выключыў двурушніка Магарама з партыі, і яго спроба зманеўраваць, астацца ў ценю аказалася бітай.

Справы ў Аграглебавым інстытуце павінны прымусіць партарганізацыю і прэзідыум Акадэміі навук прыглядзецца да астатніх інстытутаў Акадэміі і, у прыватнасці, да інстытута біялогіі. Незразумела чаму ў такі ажыўлены час барацьбы за выкрыццё шкодніцтва ў сельскай гаспадарцы і ліквідацыі яго вынікаў адсяджваецца прафесар, ён-жа і дырэктар гэтага інстытута — Дарожкін. Хіба шкодніцкая дзейнасць Пратасені і іншых ворагаў народу ў сельскагаспадарчых і навукова-даследчых установах і органах Наркамзема не закранула пытанняў, звязаных з культурай бульбы? Хіба сам Дарожкін не мае за сабой поўнага грузу памылак у сувязі з правядзімай у свой час на Беларусі шкодніцкай звышранняй сяўбой? Хіба няма ў яго памылак у адносінах да нацдэмаў і т. д.? Партыйная арганізацыя Акадэміі павінна пацікавіцца, чаму такую пазіцыю займае зараз Дарожкін.

У сувязі з усім сказаным трэба адзначыць, што прэзідыум Акадэміі навук і яе кіраўнік т. Сурта, відаць, дрэнна ведаюць сапраўднае становішча спраў у інстытутах Акадэміі. У акадэміі яшчэ не разгорнута сапраўдная барацьба за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва, за выкананне дырэктыў Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б), указанняў таварыша Сталіна і рашэнняў XVI з'езда КП(б)Б.

Н. ПУЗІКАЎ.
І. ШЛЯФЕР.

УБОРКУ ПРАВЯДЗЕМ БЕЗ СТРАТ

На нашай машынна-трактарнай станцыі ёсць чатыры трактарныя (дзесяцібутавыя) снопавязалкі. Тры ўжо адрамантаваны. Гэтыя дні мы скарыстоўваем для таго, каб яшчэ раз праверыць кожную ніталь машыны, добра адрэгуліраваць рэжучы апарат, абкатаць трактарам.

Праз дзень-два мы выязджаем у калгасы на спраўных снопавязалках. Леташні вопыт вучыць нас, што поспехі работы залежаць галоўным чынам ад таго, як будзе падрыхтавана машына да ўборкі. Летась было на нашай станцыі так: снопавязалкі вышлі жаць няспраўнымі, нават не абкатанымі. Толькі прыступілі да работы — і машыны пачалі псавацца. А гэта таму, што снопавязальшчыкі іх не рамантавалі, за гатоўнасць іх ніхто не адказваў.

Мы ўлічылі гэтыя ўрокі. Рамонт правялі высокаякасна. Самі рамантавалі машыну, на якой будзем працаваць. Таксама падабралі лепшых трактарыстаў і трактары на прычэп.

На спраўных снопавязалках кожны з нас убярэ ў бягучым сезоне не менш як з 150 гектараў. На ўборцы мы будзем рашуча змагацца са стратамі, каб давысіць кошт працадня калгасніка. Да снопавязалак прыстасоўваем зернаўлавіцелі, аглядаем палотны.

Мы ўпэўнены, што сваё абавязацельства з поспехам выканаем. Толькі дапамогу ў гэтым нам павінны аказаць дырэкцыя машынна-трактарнай станцыі і старшыні калгасаў.

Узяць, напрыклад, участкі. Ах таго, як будуць яны падабраны, залежыць выкананне нормы і якасць. На-жаль, аб участках мы яшчэ ніякага ўяўлення не маем. Дырэктар МТС т. Боеў і старшы аграном т. Ткачэнка не далі нам магчымасці самім прымаць удзел у падборы ўчасткаў. Яны адкладваюць гэту важнейшую справу на апошнія дні. Дагаворы заключылі і на гэтым супакоіліся.

Скора мы выязджаем у поле, а ўчасткаў не ведаем, маршрутаў таксама.

Снопавязалкі яшчэ не забяспечаны шпагатам. Старшы механік і дырэктар МТС ўсё збіраюцца закупіць шпагат. Але мы яго як не мелі, так і не маем.

Такія адносіны да нас, снопавязальшчыкаў, з боку дырэкцыі машынна-трактарнай станцыі ствараюць сур'ёзную пагрозу ў рабоце.

Мы патрабуем большай увагі дырэкцыі станцыі да падбору ўчасткаў, сапраўднай дапамогі арганізаваць работу снопавязалак. Кожны снопавязальшчык павінен быць гатоў да выхаду ў поле, бо час уборкі падышоў бліжа.

Перад уборкаю кожны снопавязальшчык павінен ведаць участкі, як свае пяць пальцаў, яшчэ раз праверыць машыну, забяспечыць яе патрэбнымі запаснымі часткамі, шпагатам і інш. Асноўная ўмова паспяховай работы — правільны тэхнічны догляд снопавязалкі. Пра гэта павінен памятаць кожны снопавязальшчык.

Снопавязальшчыкі, машыністы жняярак і лобагрэек павінны разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва на баявую падрыхтоўку і ўзорнае правядзенне ўборкі ўраджаю, без страт, за павелічэнне кошту працадня ў кожным калгасе.

ГАЛЬКЕВІЧ Вацлаў і СТОМА Нікалай,
снопавязальшчыкі Талачынскай МТС.

НЕДАПУШЧАЛЬНАЯ САМАСУПАКОЕНАСЦЬ

Мы праехалі палі і праглядзелі пасевы сельскагаспадарчых ацэлеў «Чырвоны баец», «Першае мая», «Чырвоны сцяг», «Кастрычніцкая перамога», «Дзень ураджаю» і інш. Тураўскага раёна. Ва ўсіх калгасах віды на ўраджай пшаніцы, азімага жыта надзвычай добрыя.

Пасля прайшоўшых у апошнія дні вялікіх дажджоў яравыя пасевы моцна зазеляненелі, дружна пачалі расці, знікае нясвоечасовая жаўцізна.

Уборка багатага ўраджаю, захаванне яго ад страт і псавання з'яўляецца сур'ёзнейшай справай.

Але, відаць, не разумеюць гэтага кіраўнікі тураўскіх раённых арганізацый. Райком партыі (сакратар т. Дамброўскі), райвыканком (старшыня т. Шаршнёў) справу падрыхтоўкі да ўборкі па сутнасці аддалі на волкуп райземаддзелу і МТС. А загадчык райза т. Грашчанка і дырэктар МТС т. Віхліс праўманай, ізалевай работай не займаюцца, а мітусяцца.

У раёне мяркуюць убраць зернавых культур машынамі 5.000 гектараў і 1.000 гектараў сярпамі. Асноўная ўборачная машына — жняярка-самаскідка. Але на 28 чэрвеня з 60 жняярак-самаскідак было адрамантавана ўсяго толькі 40. Да жняярак-снопавязалак не загатоўлена ў неабходнай колькасці шпагату. З 120 зернаачышчальных машын адрамантавана толькі 36, з 43 конных малатарак падрыхтавана да работы 25.

Змазачныя маслы непадрыхтаваны.

У калгасе «Новае жыццё» дрэнна даглядаюць пасевы. Лепшую канаплю стапталі дзеці, лазячы ў вішні. Не ўсе жняяркі адрамантаваны; гумны, павеці, зернахавальнікі не прадэзінфектаваны. Няма ў гэтым калгасе і плана ўборачных работ. Старшыня калгаса Шарэнда — гэты балбатун і заўзяты адміністратар—імкнецца ўтоіць сапраўднае становішча ў калгасе, ён выхваляецца:

— Я чалавек востры. Цісну! За непаразкі няма ў мяне спуску, няма нікому. Цісну!

У калгасах Азяранскага сельсовета таксама не ўсё добра з падрыхтоўкай да ўборкі. Старшыні калгасаў Саскевіч, Гарасюк і інш. не падаюць надежнага значэння арганізацыі працы. Брыгады яшчэ не атрымалі дакладных ўраджайных планаў. Калгаснікі сельгасарцеляў «16 партз'езд», «Перамога», «Кастрычніцкая перамога» і інш. не ведаюць сваё месца ў брыгадзе па рабоце, сваіх абавязкаў у час уборкі. Не кожнаму вядомы нормы выпрацоўкі і распэнкі.

У калгасах раёна дрэнна падрыхтоўваюць гумны, свірны, зернахавальні для прыёмкі зярна. Многія з іх, як напрыклад, у калгасах «На варпе», «XVI партз'езд» заражаны кляшчом.

Становішча з падрыхтоўкай да ўборкі і пяперашняя пазіцыя кіраўнікоў Тураўскага раёна да гэтай важнейшай справы не могуць быць цярпімы.

З. МАТУЗАЎ.

РАСПАЧАЛІ ЖНІВО

Рад калгасаў Брагінскага раёна прыступілі да жніва азімых і яравых культур. Калгас «Інтэрнацыянал», Савінкага сельсовета, зжаў 6 гектар ячменю. Калгаснікі гэтай сельгасарцелі Каржанеўская, Беразняцкая, Кубар штодзённа правыконваюць нормы выпрацоўкі па жніву.

Трэба адзначыць, што райземаддзел (загадчык Катляроў) не ведае з чым калгасы сустрэлі ўборачную кампанію. У раёне ёсць 139 жняярак, з якіх, па зводцы райземаддзела, адрамантавана ўсяго 114. Зернаўлавіцелі прыстасаваны толькі да 39 жняярак.

ПРОТЧАНКА.

ПАЗЫКА ЎМАЦАВАННЯ АБАРОНЫ СССР

АРГАНІЗОЎВАЮЧЫ МАСЫ

У адказ на здрадніцкую і подлую дзейнасць расстраляннай фашысцкай банды Тухачэўскага, Убарэвіча, Якіра і інш чыгуначнікі звярнуліся да Ўрада з просьбай выпусціць пазыку Ўмацавання абароны Саюза ССР.

Наш рабочы калектыў поўнасцю далучыўся да голасу чыгуначнікаў і падтрымаў іх просьбу.

Па ўсіх цэхах былі праведзены мітынгі, палітгутаркі. Кожнага рабочага мы азнаёмілі з той шкодніцкай работай і прадажніцтвам радзімы, якую праводзілі фашысцкія агенты.

З пагардай, злобай і нянавісцю рабочыя праклінялі гэтых мярзотных здраднікаў. Рабочыя на мітынгах і палітгутарках абавязваліся прыняць самы актыўны ўдзел у падпісцы на пазыку і гэтым яшчэ больш умацаваць абароназдольнасць нашай радзімы.

Вось што гаварыла стахановка абознай вытворчасці Лысова:

— З нецярплівасцю я чакала таго дня і гадзіны, калі наш урад выпусціць новую пазыку. Я першая падпісваюся на 100 проц. месячнага заработку і заклікаю рабочых паследзаць майму прыкладу.

У сваім выступленні прафорг лесапэха т. Шулькін з агідай успамінаў імёны тых нядоніжаў, якія здрадзілі нашай радзіме і прадаліся фашысцкім контрразведкам. «Адказам на іх подлую дзейнасць, — гаварыў ён, — будзе наш актыўны ўдзел ва ўмацаванні абароназдольнасці краіны. Мы як ніколі арганізавана праядзем падпіску на пазыку».

Такіх выступленняў можна было-б прывесці вельмі многа. Але і гэтыя дастаткова характарызуюць з якой актыўнасцю і энтузіязмам рабочыя сустрэлі апублікаванне пастановы аб выпуску «Пазыкі Ўмацавання абароны Саюза ССР».

Да апублікавання пастановы аб выпуску пазыкі партыйная арганізацыя правяла зялікую падрыхтоўчую работу. Кожны агітатар на сваім участку штодзённа растлумачваў рабочым і работніцам значэнне пазыкі, умовы і парадак яе размяшчэння. Парткомам былі пазабраны і расстаўлены па ўчастках людзі, на якіх усклавалася адказнасць за правядзенне падпіскі сярод поўнай групы рабочых. З гэтымі людзьмі была праведзена нарада, на якой ім былі даны канкрэтныя ўказанні аб метадах правядзення падпіскі.

Як толькі рабочыя дазналіся аб апублікаванні пастановы Ўрада, пачалася падпіска на пазыку. Усе прымацаванцы на цэхаў комуністы, комсамольцы, спачуваючыя, беспартыйныя актывісты пачалі абыходзіць цэхі. З кожным рабочым праводзіліся індывідуальныя гутаркі.

У маблезым цэху быў такі выпадак, калі адна работніца, нядаўна працуючая на фабрыцы, спачатку не хацела падпісацца. Пасля таго, як ёй растлумачылі значэнне пазыкі, пра выгады, якія яна дае падпісчыку, работніца падпісалася. У выніку праведзенай масава-палітычнай работы мы дабіліся таго, што наш камбінат скончыў падпіску на пазыку на другі-ж дзень пасля перадачы дэкрэта па радыё.

Усяго ахоплена падпіскай 2339 чалавек на суму 229 тысяч рублёў. Дзесяткі тэлеграм, пісем, заяў паступае ў здрав заўкома з гаралоў Магнітагорска, Сталіно і інш., — адпускнікі просяць падпісаць іх на пазыку.

Ніхто не хоча астацца без абліганый Пазыкі Ўмацавання абароны краіны. Уся работа па правядзенню падпіскі на пазыку праходзіла пад лозунгам: «Паспяховым размяшчэннем Пазыкі Ўмацавання абароны Ўмацуем магутнасць нашай сацыялістычнай радзімы».

ГЕРМАН.
Сакратар парткома камбіната імя Гікало.

ШЧЫРЫЯ СЛОВЫ СТАРОИ КАЛГАСНІЦЫ

УЗДА. Сход калгаснікаў пагранічнага калгаса імя Леніна быў народкасць шматлюдным. На сход з'явіліся ўсе, ад старога да малога. Дакладчык тав. Бокун гаварыў аб значэнні пазыкі, аб задачах умацавання абароны краіны.

Хто хоча выказацца? — запытаў пасля даклада старшыня схода.

— Выказвацца будзем падпіскай, — заявіў стахановец Трэцяк Міхась. — Прашу запісаць мяне на 45 руб.

— Мяне на 50, папрасіў Ахрэмчык Язэп.

— Да стала падышоў Жэхка Сцяпан, падпісаў сваё імя і прозвішча і паставіў лічбу 60.

Пагранічны калгас імя Леніна, а таксама калгасы «Інтэрнацыянал», «Усход», «Каменка» першымі ў раёне правялі падпіску на пазыку абароны з ахопам усіх калгаснікаў.

У калгасе «Каменка» прышла вечарам на кватэру брыгадзіра 70-гадовая старая Крэмез Домна і заявіла:

— Я не ведала аб тым, што раніцаю сход склікаўся і аб пазыцы там гаварылі, а зараз, як даведалася, прашу падпісаць і мяне на 30 руб. Я гэтыя грошы пазычаю дзяржаве зд шчырага сэрца, каб наша войска чырвонае яшчэ больш моцнае было, каб ніякім ворагам не давялося таптаць нашай калгаснай зямлі і разбурань наша шчаслівае жыццё, якога я хоць на старасці год дачакалася.

Я. ІВАШЫН.

ХРОНІКА ПАЗЫКІ

КАПАТКЕВІЧЫ. На 7 ліпеня па раёну падпіскай на Пазыку Ўмацавання абароны СССР ахоплена 6.605 чалавек на суму 353.705 рублёў. На пазыку падпісаліся ўсе калгаснікі калгаса «Новы араты» на 4.500 рублёў. Калгаснік Цыгай падпісаўся на 100 рублёў.

***

ЛЁЗНА. Дружна праходзіць у раёне падпіска на Пазыку Ўмацавання абароны СССР. Калгаснікі з радасцю даюць у пазыку дзяржаве свой двух-трохтыднёвы даход. На мітынгу ў калгасе «Полымя» маці лейтэнанта Галеева заявіла: «Я з гонарам падпісваюся на пазыку, бо ведаю, што гэтыя грошы пойдуць на ўмацаванне нашых граніц. Я заклікаю ўсіх калгаснікаў і калгасніц падпісацца на гэту пазыку».

На 6 ліпеня сума падпіскі на пазыку па раёну склала 660 тыс. рублёў.

63.843 ПРАЦОЎНЫХ ВІЦЕБШЧЫНЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ПАЗЫКУ

ВІЦЕБСК. Паводле даных горашчадкасы, на 8 ліпеня 63.843 працоўных горада і раёна падпісаліся на пазыку на 8.142.700 рублёў. На чыгуначным вузле падпіскай ахоплены ўсе рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя. Паспяхова праходзіць падпіска сярод навуковых работнікаў. Прафесары Марзон і Карпілаў падпісаліся на 1.500 рублёў кожны. (БЕЛТА).

ІДЭАЛАГІЧНАМУ ФРОНТУ — МАКСІМУМ УВАГІ*)

І. З. СУРТА

Прэзідэнт Акадэміі навук БССР

Рашэнні лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) маюць гістарычнае значэнне. Гэтыя рашэнні, даклад і заключнае слова таварыша Сталіна адкрылі новую паласу ў партыйным будаўніцтве, у жыцці нашай партыі, у жыцці нашай краіны.

Сталінская Канстытуцыя, даклад таварыша Сталіна на з'ездзе Саветаў, на Пленуме ЦК і рашэнні Пленума Цэнтральнага Камітэта стаяць у адным радзе развіцця марксісцка-ленінскага вучэння аб нашай партыі, аб нашай дзяржаве, аб дыктатуры пролетарыята ў эпоху сацыялізма, пазымаючы нашу дзяржаву—Саюз Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік — на такую вышыню, аб якой лепшыя ўмы чалавецтва ў мінулым не маглі і марыць.

Як-жа ў нас, у БССР, у КП(б)Б, некаторыя кіраўнікі разумелі значэнне рашэнняў партыі, значэнне Сталінскай Канстытуцыі ў справе будаўніцтва нашай дзяржавы — Беларускай Совецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, як неадрыўнай часткі вялікага Совецкага Саюза?

Урад, Цэнтральны Камітэт партыі ў свой час стварылі Канстытуцыйную камісію па выпрацоўцы Канстытуцыі БССР. Галаэдзед, якому было даручана складанне праекта Канстытуцыі, наўмысла дапусціў у ім буйнейшыя палітычныя памылкі.

У артыкуле 13-м гэтага праекта Галаэдзед імкнуўся змазаць вядучую, авангардную ролю рабочага класа. Ён у сваім праекце прапягвае сваю антыленінскую, антыпартыйную лінію.

Не гледзячы на катэгарычны адпор нашай камісіі, выступленні тт. Гікало, Валковіча, маё і іншых таварышоў, Галаэдзед усё-ж упартым чынам абараняў свой антымарксісцкі тэзіс.

Вядома, што падобнага роду «тэорыя», нацдэмаўскага, трацкісцкага парадку, абаранялася ў работах мацёрага ворага Шчарбакова і іншых.

Галаэдзед імкнуўся, па сутнасці справы, уваскрасіць гэтыя контрэволюцыйныя тэорыі іх і ў завуаляванай форме пра-

*) Перапрацаваная стэнаграма выступлення на XVI з'ездзе КП(б)Б.

дягнуць у асноўны закон нашай рэспублікі.

У тым-жа артыкуле Галаэдзед бярэ ўсіх сялян (я падкрэсліваю — усіх сялян) за адну дужку. Па Галаэдзеду выходзіць, што ў стварэнні БССР, у вызваленні Беларусі ад царызма нам дапамог не рускі рабочы клас, а ўсё сялянства ў цэлым, у тым ліку і кулацтва, да якога Галаэдзед, чамусьці, вельмі няроўнадушны.

Не трудна заўважыць, што палажэнні, выстаўленыя Галаэдзедам, супярэчаць вучэнню Леніна—Сталіна, з якога вынікае, што ў кастрычніку 1917 года, як указваў таварыш Сталін, асноўнай сілай рэволюцыі з'яўляўся пролетарыят, а бліжэйшым рэзервам — бяднейшае сялянства. Галаэдзед да апошніх дзён **адмаўляў сацыялістычны характар Кастрычніцкай рэволюцыі.**

У 56-ты артыкул праекта Галаэдзед імкнуўся прапягнуць **хутарскую** сістэму. Ён імкнуўся замацаваць гэту сістэму ў асноўным законе нашай рэспублікі. Мы і гэтаму таксама далі адпор. Гэту фармуліроўку Галаэдзеда з праекта Канстытуцыі выкінулі.

Галаэдзед сваёй уласнай антыпартыйнай дзейнасцю імкнуўся **супроцьпаставіць Канстытуцыю БССР вялікай Сталінскай Канстытуцыі.** Не дзіўна, што Галаэдзед, выступаючы на з'ездзе Саветаў, у дакладзе выпусціў палажэнне аб тым, што Канстытуцыя БССР ёсць **Сталінская Канстытуцыя.**

Характар памылак Галаэдзеда супадае не толькі з лініяй правых, нацдэмаўскіх і эсэраўскіх бандытаў, але і царскіх сатрапаў тыпу Сталыпіна.

У свой час у часопісе «Пад сцягам марксізма» я пісаў аб неабходнасці разбіць нацдэмаўскія тэорыі Карпа, які арыентаваў гаспадарку БССР на Польшчу. Праз пару месяцаў мяне сустракае Галаэдзед і, літаральна, дапытвае — на якой падставе я адважыўся выступіць супроць такога «незвычайнага», як ён выражаўся, работніка з Беларусі, не параіўшыся з ім, Галаэдзедам.

Карп, апрача арыентацыі на Польшчу, прама салідарызаваўся з бандытам Троцкім у пытанні аб інтэлігенцыі і ў многім іншым. Карп не толькі прапаведнік трацкісцка-нацдэмаўскіх тэорый, але і прадстаўнік інтарэсаў польскай, літоўскай, латвійскай і заходне-беларускай буржуазіі ў БССР.

Раз Галаэдзед паўстае супроць выкрыцця гэтых контрэволюцыйных тэорый Карпа, значыць ён з ім цалкам і поўнасцю згодзен. Згаджаўся і салідарызаваўся Галаэдзед і з іншымі ворагамі. Мы не ведаем выпадку, каб Галаэдзед калі-небудзь выступіў супроць гэтых контрэволюцыйных, нацыянал-фашысцкіх тэорый.

Трэба пакапацца ў галаэдзедаўскіх архівах. Гэтыя архівы дадуць багацейшы матэрыял па выкрыццю не толькі Галаэдзеда, але і тых, хто з ім быў звязан.

Мы абмяжоўваліся выкрыццём асобных памылак Галаэдзеда. А справа ідзе іменна аб контрэволюцыйнай **лініі** правых, аснашчонай контрэволюцыйнай нацдэмаўшчынай, паказваючы варожае нутро Галаэдзеда.

Групавая барацьба Галаэдзеда была не проста беспрынцыпнай склокай супроць некаторых асоб, а была іменна антыпартыйнай лініяй — лініяй правых растаўратараў і нацдэмаў супроць партыі і супроць ЦК.

Рашэнне аб знятцы Галаэдзеда з'яўляецца адзіна правільным арганізацыйным вывадам, зробленым сёння. Але гэтага, відавочна, будзе мала заўтра. На мінскай партыйнай канферэнцыі ваенныя работнікі гаварылі, што шпіён Убарэвіч арыентаваў іх толькі на Галаэдзеда. І гэта не выпадкова.

Блізасць Галаэдзеда з фашысцкім шпіёнам, з ворагам народу Убарэвічам ёсць сувязь не бытавая, як гэта тлумачыў Галаэдзед, не звычайная, а палітычная, як палітычных аднадумцаў. Галаэдзед ніколі не сказаў, што ён не згодзен з Убарэвічам. У Убарэвіча не было разгалосся з Галаэдзедам. У іх было поўнае адзінства поглядаў і дзеянняў супроць лініі ЦК партыі. Трэба мець на ўвазе, што ў Галаэдзеда былі, і зараз ёсць, свае людзі ў наркаматах і ў райвыканкомах. Чаму яны аб гэтым маўчаць, нідзе, ні на адной партыйнай канферэнцыі не выступілі з выкрыццём палітычнай лініі Галаэдзеда і яго правай контрэволюцыйнай практыкі? Рад раёнаў год ад года знаходзіцца ў прарыве. Лічу недастатковым кваліфікаваць гэтых людзей проста як заржавелых, запляснелых; іх трэба назваць палітычнай мовай.

Я лічу зусім правільнай ацэнку, якую даў у дакладзе таварыш Шаранговіч, становішчу ідэалагічнага фронта. У галіне нашай культуры мы маем многа недахопаў. Навуковыя ўстановы засмечаны чужымі людзьмі. Возьмем Акадэмію навук: увесь былы «генералітэт» Горына (дырэктары інстытута і інш. арганізацый Акадэміі) складаўся з буйнейшых контрэволюцыянераў, шпіёнаў, нацдэмаў, трацкістаў і інш., меўшых прамыя адносіны да другога адзела генеральнага штаба фашысцкай Польшчы. Калі партыя пачысціла гэту контрэволюцыю, Горын не адзін раз гаварыў: «Калі партыя граміла нацдэмаўскую контрэволюцыю, то папярпела і навука». Аднак, ніякіх адносін гэтыя тыпы да навукі не мелі, хапя «навуковыя» званні ім былі далёкі Горыным (напрыклад, Чудзенку, калчакоўскаму афіцэру). Горын прыкрываў гэту контрэволюцыйную зграю. Мы не выкрылі шпіянаж і шкодніцтва Домбаля. Мы не выкрылі і трацкісцкіх памылак у працах Горына, напрыклад, у рабоце «Советы 1905 г.». Гэту працу ён перавыдае ў 1935 г. у трэці раз, але, па сутнасці, мала яе зменяе, паўтарае тыя-ж самыя памылкі.

Горын у гэтай працы не разбівае варожых партыі тэорый ворагаў народу, а палемізуе з імі, пачынаючы з обер-бандыта Троцкага, Зіноўева, Шляпнікава, Неўскага (якія нават у 1935 г. усё яшчэ ў Горына велічаюцца «таварышамі». Можа быць, Неўскі і Зіноўеў і на самой справе былі Горыну таварышамі).

Горын лічыць погляды Троцкага проста памылковымі, а яго меншавікам—прыхрытым левай фразай. Горын не разглядаў Троцкага як фашысцкага обер-бандыта, а як памыліўшагася левака. Гэта зыцкае з усёй працы Горына, першае выданне якой было проста спісана ў Троцкага.

Неабходна ў бліжэйшы час падвергнуць жорсткай большавіцкай крытыцы як працу Горына «Советы 1905 г.», так і іншыя працы. Горын, які належыць да школкі Пакроўскага, прысвяціў яму не адну працу, да рэчы сказаць, своечасова знятую з ужывання. Як вядома, Горын аб сваёй апалагетыцы Пакроўскага пакуль нідзе ні адзіным словам не абмовіўся.

Мы знялі з Акадэміі за 1936 год каля 100 чал. навуковых работнікаў (з 650). Нельга сказаць, аднак, што на сёнешні дзень мы ўсіх ворагаў выгналі. Мы маем адрыў навуковых устаноў ад практыкі соцыялістычнага будаўніцтва. Каб вывесці 2—3 інстытуты на калгасныя палі, спатрэбіўся год; толькі ў канцы мінулага года ўдалося ў частку раёнаў выцягнуць некаторыя інстытуты. У БССР многія інстытуты на працягу больш дзесятка гадоў не выдалі ні адной навуковай працы. Яны-ж праелі дзесяткі мільёнаў рублёў народных грошай. Многія гэта называюць нерэнтабельнасцю і не могуць заўважыць шкодніцтва ў інстытутах. Планаванне навуковых кадраў было галаэдзедаўскім, гэта значыць—пераведзеным на паперу і пахаваным у архівах СНК. Любовіч не зможа прывесці ні аднаго такога факта, каб СНК падтрымаў якое-небудзь культурнае мерапрыемства ў галіне абслугоўвання малодшых навуковых работнікаў. У нас дрэнна з жыллём для навуковых работнікаў, з прычыны домбалеўскага шкодніцтва і агідная снабжэння будматэрыяламі. Дзяржпланам, з тае прычыны, што Галаэдзед сарваў афармленне тытула Акадэміі навук БССР на 1937 год. Мы, па сутнасці, правальваем адну з буйнейшых будоўляў у БССР — будынак Акадэміі навук.

Галаэдзед праз СНК і Дзяржплан, па сутнасці, разбурыў матэрыяльную базу па падрыхтоўцы навуковых кадраў БССР.

Чаму ў нас адсутнічае сур'ёзная навуковая прадукцыя, асабліва па гуманітарных дысцыплінах? Уся работа па гісторыі БССР, гісторыі беларускай літаратуры, мовы, эканомікі і інш. да гэтага часу была ў руках ворагаў партыі (Югава, Рыўліна, Ігнатоўскага, Мятлы, Жылуновіча, Мацюковіча, Домбаля, Пятровіча і інш.). Трацкісцка-нацдэмаўская і правая контрэволюцыя наносіла нам вялікую шкоду, вынікі якой мы яшчэ не ліквідавалі.

На з'ездзе выступаў т. Готфрыд. Нельга згадзіцца з ім, што ідэалогія папоўская менш небяспечна, чым папоўская палітыка. Вядома, поп будзе старацца прасоўвацца ў Советы: ён будзе старацца папасці ў органы кіравання. Але з якога гэта часу мы павінны, замест выкрыцця ідэалогіі папа, як карэннага ворага марксізма-ленінізма, здымаць гэту небяспеку? Нельга нам ідэалогію адрываць ад палітыкі.

У прамове тав. Готфрыда недастаткова былі адценены і задачы барацьбы з сектантамі. Мы недаацэньваем гэтай барацьбы. Трэба прама сказаць, што не толькі сектант, але і поп сёння стаў іншым. Сектанты спрытныя людзі; яны праводзяць сваю справу больш тонка і лоўка, чым папы.

У Лепельскім раёне, напрыклад, сектанты прыклалі сваю руку да работы супроць совецкай улады. Яны нават маўчаннем супроць нас дзейнічаюць. З гэтага, аднак, не выцякае, што барацьба з **папамі** павінна быць аслаблена. Наадварот — **не трэба ўзмацніць.**

У дакладзе таварыша **Сталіна** аб Канстытуцыі прама сказана:

«Калі народ сям-там і выбярэ варожых людзей, то гэта будзе азначаць, што наша агітацыйная работа пастаўлена з рук вон дрэнна....»

«Значыць, трэба працаваць, а не хныкаць».

Неабходна стварыць пастаянныя кадры агітатараў антырэлігійнікаў. Трэба нам у бліжэйшы час разгарнуць энергічную антырэлігійную работу, перагледзець антырэлігійную літаратуру і выдаць танным масавым тыражом. У нас такой літаратуры дастаткова. Мы маем найбагацейшую марксісцкую антырэлігійную літаратуру. Вядома, што Ленін рэкамендаваў па гэтай лініі скарыстоўваць нават і французскіх матэрыялістаў XVIII стагоддзя, у якіх вельмі ўмела і востра ставілася пытанне антырэлігійнай прапаганды.

Ворог народу Бубноўскіх гробіў нам гэту справу сядома.

Чаму культпроп ЦК, у прыватнасці тав. Готфрыд, як след не возьмецца за арганізацыю антырэлігійнай

4-я СЕСІЯ ЦВК САЮЗА ССР VII СКЛІКАННЯ

АБ ПРАЕКЦЕ „ПАЛАЖЭННЯ АБ ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ САЮЗА ССР“

Працяг даклада т. ЯКАЎЛЕВА Я. А. 4-й Сесіі ЦВК СССР VII склікання 7 ліпеня 1937 года

Тое-ж самае ўсеагульнае выбарчае права, якое значная частка буржуазна-дэмакратычных краін прызнае ў сваіх канстытуцыях і фармальна ажыццяўляе пры выбарах, але якое на справе абкарнываецца, уразаецца, адмяняецца дзесяткамі спосабаў самім механізмам капіталістычнай дэмакратыі, выключаючым і выпятурхоўваючым рабочых, беднякоў-сялян і радавых інтэлігентаў з актыўнага ўдзелу ў дэмакратыі, — наш праект выбарчага закона ператварае: у зброю ўцягвання ўсёй масы працоўных у палітыку, у сродак упягнення ўсяго народу ў актыўны ўдзел у дэмакратыі, ва ўсесабымную зброю народнага кантролю за сваімі выбраннікамі.

Тут наша партыя, советы кіруюцца ўказаннем таварыша Сталіна на III Усерасійскім З'ездзе Советаў дзевятнаццаць год назад:

«Нам, прадстаўнікам рабочых нізоў, трэба, каб народ быў не толькі галасуючым, але і кіруючым».

Справа выбараў — справа вельмі сур'ёзная, — да яе трэба падрыхтавацца сур'ёзна. Да выбараў асталося толькі некалькі месяцаў, а падрыхтоўка выбараў і самое правядзенне выбараў патрабуюць найвялікшай арганізаванасці.

У нас яшчэ сустракаюцца такія дзівакі, якія разумеюць дэмакратыю, як анархічную распушчанасць, як урачыстасць безначалля. Няма чаго гаварыць аб тым, што гэта не наш, не большэвіцкі, не ленінска-сталінскі погляд. Дэмакратыя не ёсць безначалле, наадварот, дэмакратыя азначае наяўнасць арганізаванай дзяржавы, наяўнасць урада, наяўнасць працаздольных цэнтраў грамадскіх арганізацый.

Дэмакратыя не ёсць адмаўленне ад арганізаванасці, наадварот, дэмакратыя ёсць вышэйшая арганізаванасць, можна сказаць,—завяршэнне арганізаванасці. Наша пролетарская дэмакратыя азначае і патрабуе, у першую чаргу, максімальнай арганізаванасці ад рабочага класа, які кіруе рабоча-сялянскім саюзам, ад яго авангарда — комуністычнай партыі.

Няўхільнае ажыццяўленне Канстытуцыі СССР і выцякаючага з сталінскай Канстытуцыі Выбарчага закона несумненна забяспечыць далейшае разгортванне совецкай дэмакратыі, расшырэнне базы пролетарскай дыктатуры. Няўхільнае ажыццяўленне сталінскай Канстытуцыі і Выбарчага закона несумненна забяспечыць на аснове крытыкі недахопаў работы Советаў і вылучэння ў Советы новых людзей паляпшэнне работы Советаў зверху данізу. Сілу народнага палтрымання Советаў правяралі на сваёй шкуры нашы ворагі не раз. Што ўвесь народ стаіць спяной за Советы — у гэтым лішні раз надаўна пераканаліся германа-японскія фашысты ў трацкісцкай ці бухарынскай лічыне, — наша рабоча-сялянская краіна раздушыла іх, як клапоў. **(Апладысменты).**

Няўхільнае ажыццяўленне новай Канстытуцыі СССР і выцякаючага з Сталінскай Канстытуцыі выбарчага закона забяспечыць яшчэ большае згуртаванне вакол Советаў народных мас і абранне такога Вярхоўнага Совета СССР і такіх Советаў дэпутатаў працоўных, якія пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна правядуць у жыццё Сталінскую Канстытуцыю і павядуць народы СССР, сакрушаючы ўсіх і ўсякіх ворагаў рабочага класа і сялянства, да новых перамог у справе будаўніцтва сацыялізма. **(Доўгія апладысменты. Усе ўстаюць).**

ХОД СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ РАБОТ ПА БССР

Па даных Наркамзема, па калгасах БССР на 5 ліпеня г. г. скошана натуральных сенажацей 55,5 проц. Прырост за першую пяцідзёнку ліпеня складае толькі 15,6 проц. Толькі адзін Грэскі раён выканаў план сенакашэння. Набліжаюцца да выканання Уздзенскі (90,2 проц.), Капыльскі (87,6 проц.), Заслаўскі (86,5 проц.), Чырвонаслабодскі (86,3 проц.) і іншыя раёны.

Недапушчальна зацягваюць сенакашэнне Суражскі раён, які выканаў план толькі на 22,2 проц., Мехаўскі — 29,5 проц., Магілеўскі — 33,8 проц., Дубровенскі — 34,0 проц. і інш.

З усяго скошанага ў калгасах звезена і застагавана сена 79 проц. Вялікі разрыў паміж сенакашэннем і стагаваннем нагляда́ецца ў адстаючых па сенаўборцы раёнах. Напрыклад, у Дубровенскім раёне застагавана сена да скошанага толькі 28,2 проц., Магілеўскім — 58,2 проц., Суражскім — 64,9 проц.

План сіласавання па калгасах выканан толькі на 12,5 проц. Першая пяцідзёнка ліпеня не дала амаль ніякага прыросту. На 30 чэрвеня было засіласавана 11 проц. Круглянскі раён да гэтага часу зусім не прыступіў да сіласавання. У Магілеўскім раёне засіласавана 0,9 проц., Чэрвеньскім — 0,8 проц., Быхаўскім — 1,4 проц., Шклоўскім — 1,4 проц., Старадарожскім — 1,3 проц., Смалявіцкім — 1 проц. і інш.

Папараў паднята 65,1 проц., цаліны пад ворыва — 17,2 проц., цаліны пад залужанне — 14 проц. За апошнюю пяцідзёнку прырост па падняццю папараў і цаліны зусім нязначны.

Акучана бульбы ў другі раз 44,8 проц. На 30 чэрвеня было 27,7 проц.

НА II МІЖНАРОДНЫМ КАНГРЭСЕ ПІСЬМЕННІКАЎ

МАДРЫД, 8 ліпеня. (БЕЛТА). II Міжнародны канграс пісьменнікаў не падобен на звычайныя з'езды гэтага роду. Ён адбываецца ў абстаноўцы лютай грамадзянскай вайны. Гераічны Мадрыд — пад абстрэлам. Пісьменнікі, кнігі якіх чытае ўвесь свет, засядаюць разам з байцамі, не паспеўшымі атрэсці пыл акопаў са свайго адзення.

Не паспелі адгрымець палкія словы французскага рэжысёра Леона Мусінака, як на трыбуне паяўляюцца радасныя, поўныя рашучасці твары іспанскай моладзі. Канграс праважае іх бурнай авацыяй. На трыбуне англійскі пісьменнік Бейтс. Ён змагаецца ў радах рэспубліканскай арміі.

Яшчэ грымяць апладысменты, але старшыня аб'яўляе, што слова мае тав. Вішнеўскі — аўтар «Мы из Кронштадта». Канграс устае. Доўга не змаўкаюць авацыі ў гонар Совецкага Саюза.

Італьянскі пісьменнік Потэнча запэўняе іспанскі народ, што народ Італіі, які стогне пад фашысцкім ботам, салідарны з непераможным іспанскім народам.

Кітайскі пісьменнік Сяо гаворыць: «Барацьба за свабодную Іспанію — гэта барацьба за свабодны Кітай, хоць гэтыя краіны раздзелены тысячамі кілометраў».

Адзін за другім выступаюць пісьменнікі Паўднёвай Амерыкі, для якіх іспанская мова — родная мова: ад Перу — Сесар Вальехо, ад Чылі — Роберто Ромеро. Выступаюць пісьменнікі Кубы, Кастарыкі, Мексікі. Яны выражаюць сваю салідарнасць са змагаючайся Іспаніяй. Зала стоячы апладыруе. Апладысменты пераходзяць у авацыю калі на трыбуне паяўляецца камандзір інтэрнацыянальнай брыгады нямецкі пісьменнік **Ганс.**

Ён заклікае дэлегатаў канграса навестаць байцоў на фронце Гвадалахары. Яго змяняе паэт Балгарыі Хрысто Белеў. Ён запэўняе іспанскіх таварышоў, што лепшыя пісьменнікі свету астануцца разам з Іспаніяй да поўнай перамогі.

7 ліпеня ўвесь канграс на франтах. Дэлегаты гутараць з байцамі ў акопах Карабанчэля, Гвадалахары, Брунетэ.

Мартын Андэрсен-Нексе, Алексей Талстой, Андрэ Мальро, Нордаль Грыг акружаны з усіх бакоў загарэлымі тварамі рабочых і сялян гераічнай Іспаніі. Не змаўкаюць воклічы ў гонар адзінага народнага фронта, у гонар Совецкага Саюза, у гонар мужнага іспанскага народу, які змагаецца за шчасце чалавецтва.

На мітынгу ў адной з брыгад выступілі з прывітальнымі прамовамі украінскі пісьменнік Мікітэнка, нямецкі паэт Эрых Вайнерт і пісьменніца Мексікі.

***

У 7 гадзін вечара адбыўся мітынг рабочых Мадрыда, на якім выступілі пісьменнікі Міхаіл Кальцоў, Андрэ Мальро і нямецкі пісьменнік Густаў Рэглер, які прыбыў на канграс, не глядзячы на свае цяжкія раненні. Ён выступаў, седзячы ў крэсле. Дэлегаты стоячы віталі мужнага змагара за свабоду іспанскага народу.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

Згодна афіцыяльнага паведамлення іспанскага міністэрства абароны, апублікаванага 7 ліпеня ў 23 гадзіны, на поўдзень ад ракі Тахо рэспубліканскія войскі занялі Сіера Суарэс і вёску Рэна. Рэспубліканцы атакуюць Сіера Рэна.

У раёне Медальін рэспубліканцы занялі Ватахенос і вышыню 327. У цэнтральным сектары мяцежнікі імкнуліся вярнуць пазіцыі, страчаныя імі 6 ліпеня. Праціўнік сканцэнтраваў вялікую колькасць самалётаў, якія развялі вялікую актыўнасць. Аднак, намаганні авіяцыі праціўніка далі вельмі нязначныя рэзультаты, дзякуючы мужнасці рэспубліканскіх лётчыкаў.

Часці рэспубліканскіх войск, заняўшыя Брунетэ (на паўднёвы захад ад Мадрыда), па-ранейшаму прасоўваюцца. Заняты новыя пазіцыі. Рэспубліканцы перасякаюць Гвадараму. Усе пазіцыі, занятыя рэспубліканцамі 6 ліпеня, захаваны, не глядзячы на атакі праціўніка. Акрамя таго, захвачаны новыя моцныя пазіцыі.

***

Паведамленні з Лондана адзначаюць вялікае стратэгічнае значэнне захвату рэспубліканцамі Брунетэ на захад ад Мадрыда. Згодна афіцыяльных паведамленняў з Мадрыда, рэспубліканцы перарэзалі дарогі паміж Мадрыдам і Таледо. Мяцежнікі ў Карабанчэлі ізаляваны.

Павоцле слоў газеты «Дэйлі Геральд», учарашнія аперацыі рэспубліканцаў маюць найбольшае значэнне з часу паражэння, нанесенага італьянскім войскам у Гвадалахары.

Рэспубліканцы, прадпрыняўшы нечаканую атаку на поўдзень ад ракі Тахо, прымусілі мяцежнікаў уцякаць.

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

Рэспубліканцы па-ранейшаму хуткімі тэмпамі наступаюць у сектары Алкала ла Рэаль (на паўднёвы захад ад правінцыі Хаэн). Народная армія прасунулася на 7—8 кілометраў у раёне на паўночны захад ад Алкала ла Рэаль. Мяцежнікі панеслі вялікія страты. Праціўнік адступае на Пуэрто Зопес.

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

Згодна паведамлення іспанскага міністэрства абароны, апублікаванага 7 ліпеня ў 23 гадзіны, мяцежнікі на біскайскім участку прадаўжаюць націск на рэспубліканскія часці. Праціўнік заняў вышыні, у раёне якіх размешчаны капальні Ален, Амалія, Марыя і інш.

НАХАБНАЯ „НОТА“ ГЕНЕРАЛА ФРАНКО

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 7 ліпеня. (БЕЛТА). Учора генерал Франко апублікаваў «ноту», адрасаваную ралу замежных дзяржаў. Франко патрабуе прадастаўлення яму права ваюючай страны і пагражае прымяніць эканамічныя рэпрасіі ў адносінах краін, якія адмовяць у прадастаўленні такіх праў. У гэтай «ноце» Англіі і Францыі прад'яўляюцца абвінавачанні ва ўмяшанні ў іспанскія справы. У заключэнне Франко пагражае парваць усякія эканамічныя сувязі з дзяржавамі, якія не падтрымліваюць зараз іспанскіх мяцежнікаў.

НАПЯРЭДАДНІ XVII ГАДАВІНЫ ВЫЗВАЛЕННЯ БССР АД БЕЛАПАЛЯКАЎ

МЕНСК У ДНІ СВЯТА

Менскі гарком КП(б)Б і горсовет праводзяць рад мерапрыемстваў у адзнаку XVII гадавіны вызвалення БССР ад белапалякаў. 10 ліпеня ў Палацы піонераў адбудзецца сустрэча піонераў з героямі грамадзянскай вайны. 11 ліпеня на сталыёне «Дынама» імя Кірава — агульнагарадскі святочны мітынг прапоўных. Пасля мітынга адбудзецца масавыя фізкультурныя выступленні. Тут-жа на сталыёне будзе дан старт удзельнікам «Беларускага велатуру». На футбольным полі адбудзецца матч паміж зборнай камандай БССР і камандай одэскай фабрыкі «Кінап». Упершыню будзе разыграна эстафета імя XVII-годдзя вызвалення БССР ад белапалякаў.

Увечары таго-ж дня на цэнтральных вуліцах Менска (каля Дома Чырвонай Арміі, Белкомунбанка і фабрыкі «КІМ» на Ленінскай вуліцы) арганізуюцца масавыя танцы. У парку імя Горкага ў гэты час — народнае гулянне.

12 ліпеня на іпадроме імя Будзённага адбудуцца конна-спартыўныя спаборніцтвы, у якіх прымуць удзел лепшыя коннікі кавалерыйскіх часцей. На сталыёне «Дынама» зноў адбудуцца масавыя фізкультурныя выступленні і ігры па баскетболу і футболу. У гэты-ж дзень у парках горада праводзяцца раённыя масоўкі працоўных. Увечары ў летнім тэатры парка імя Горкага адбудзецца сустрэча партыйна-комсамольскага актыва сталіцы з Героямі Совецкага Саюза, а таксама з героямі-пагранічнікамі.

ЭСТАФЕТА ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ ПАГРАНІЧНЫХ РАЁНАЎ БССР

Учора ў 8 гадзін раніцы ў Мозыры быў дан старт удзельнікам Паўднёвага маршрута (Мозыр—Менск) скарасной ваенізаванай эстафеты фізкультурнікаў калгасаў пагранічных раёнаў, якая прысвечана XVII гадавіне вызвалення БССР ад белапалякаў. З першага этапа адправіліся ў шлях 200 чалавек. Старт другому (паўночнаму) маршруту (Асвея—Менск) даецца сёння ў 12 гадзін дня.

Усяго ў гэтай эстафеце прымуць удзел 2000 калгаснікаў-фізкультурнікаў, усе значкісты «ГПА». Яны ўзброены вінтоўкамі і працівагазамі. Эстафета будзе рухацца ўдзень і ўночы. Калгаснікі панясуць эстафетныя вымпелы пешшу, бегам, павязуць на веласіпедах, памчаць на конях, пераправяць праз азёры і рэкі на лодках. Працягласць маршрута Мозыр—Менск 401 кілометр, Асвея—Менск — 364 кілометры.

Да фініша эстафетныя вымпелы даставяць з апошніх этапаў коннікі і веласіпедысты Дзержынскага і Заслаўскага раёнаў. Фініш адбудзецца 12 ліпеня на сталыёне «Дынама».

ГАСТРОЛІ СТАЛІНСКАГА УКРАІНСКАГА ТЭАТРА

Сёння Сталінскі Украінскі драматычны тэатр заканчвае свае гастролі ў БССР. Тэатр за час прабывання ў БССР паведаў гарады: Магілеў, Гомель і Менск і паказаў працоўным 44 спектаклі. Гастролі Сталінскага тэатра праходзілі ў нас адначасова з гастролямі Беларускага Драматычнага дзяржаўнага тэатра ў гарадах Марыупалі і Сталіно. Гастролі двух тэатраў народаў брацкіх рэспублік з'явіліся дэманстрацыйнай поспехаў тэатральнай культуры ордэнаноснай Беларусі і сацыялістычнага Данбаса.

Украінскі Сталінскі драматычны тэатр беларускаму глядачу паказаў апрача арыгінальных п'ес совецкай драматыкі («Песнь о свече» І. Качэргі і «Банкир» А. Карнейчука) багатую класічную спадчыну украінскага народу — пастаноўкі «Доки сонце зийде», «Шелменко денщик», «Наталка Полтавка» і «Сорочинская ярмарка». Усе пастаноўкі тэатра прайшлі з надзвычайным поспехам і адабрэннем. Беларускі глядач горача сустрэў прадстаўнікоў брацкага украінскага народу, які пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі стварае сацыялістычнае мастацтва.

За час прабывання ў Беларусі Сталінскі тэатр правёў значную культурную работу сярод байцоў Чырвонай Арміі. Тэатр арганізаваў спецыяльныя выезды ў вайсковыя часці з пастаноўкай сваіх лепшых спектакляў.

Сталінскі Украінскі тэатр на гастролях у БССР быў другі раз. І на гэты раз тэатр прадэманстраваў поспехі росту за перыяд ад пяцігоддзя да дзесяцігоддзя свайго існавання. Трэба сказаць, што свой дзесяцігадовы юбілей тэатр сустракае значнымі поспехамі ў стварэнні тэатральнага мастацтва. Тэатр мае сваё творчае аблічча, здольны творчы калектыў і ўмее нядрэнна даносіць да глядача багацце ідэй і вобразаў як у п'есах сучасных драматургаў, так і ў п'есах драматургаў-класікаў.

Пажадаем-жа тэатру і яго творчаму калектыву яшчэ лепш змагацца за квітнеючае мастацтва свайго народу, мастацтва, нацыянальнае па форме і сацыялістычнае па зместу.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

НАСТУПНЫЯ АСОБЫ ВЫКЛІКАЮЦЦА Ў ЦК КП(б)Б У 55 ПАКОЙ НА 11 ЛІПЕНЯ:

Ліўшыц Х. І. — Глуск; Бель Л. Э., Гінэбург Е. С., Бабіцкі Б. В., Якаўлеў А. П.— Гомель, Зуеў Д. І. — Дзержынск; Голуб В. М. — Даманавічы; Кацнельсон Е. М. — Жлобін; Габаў І. М. — Кіраўск; Грышчанка Е. Д. — Клімавічы; Ігнатоўскі Ф. І. — Лагойск; Гурэвіч Н. Л. — Крычаў; Еременка А. Е. — Чырвонаполле; Махнач П. І. — Мозыр; Вяршылаў В. В. — Мсціслаўль; Бажко Ю. Я. — Петрыкоў; Анціпенка Т. Я., Малікіна Д. Б., Чарнышоў Г. П. — Рэчыца; Малько Л. О., Паланеўскі В. Г. — Парычы; Федарышчык І. М., Шкатула А. В., Малаш П. Б. — Пухавічы; Надачытаный А. І., Шпакоўскі К. І. — Рагачоў; Зелікаў, Парохімаў Г. І. — Слуцк; Бобрыкаў А. С. — Старобін; Дзямідаў А. І., Аўдзеєў П. А., Ліпкін А. Н., Кірычэнка У. Н., Лопух Г. В., Астапенка Я. У., Радыгін В. К., Злебаў А. І., Гуткоўскі А. П., Ільенкоў К. У., Краскін Х. А. — Магілеў; Красоўскі І. А., Максімаў І. М. — Сталінскі ГРК КП(б)Б; Кучараў І. К. — Талачын; Валчок І. Ф. — Сіроціна.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

Памяшканне Беддзярждрамтэатра
З 10 ліпеня 1937 г. гастролі Маскоўскага тэатра імя МОСПО
РЭПЕРТУАР:
ВОРАГІ, СПРАВА РАДАВОГА ШЫБУНІНА, МЯЦЕЖ
ПРАФЕСАР МАМЛОК

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка»
МАЛЕНЬКАЯ МАМА

Дзіцячы гукавы кінотэатр
ДАРЫКО

Гукавы кінотэатр «Пролетарый»
ЗАЛАЦІСТАЯ ДАЛІНА

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»
«НОВЫЕ ВРЕМЕНА»

Гукавы кінотэатр «Спартак»
БЭЛА
(Німы варыянт)

ДЗЯРЖЦЫРК
(Парк імя Горкага, тэл. 22-725).
СЁННЯ
ВЯЛІКАЕ цыркавое прадстаўленне ў 3-х аддзяленнях.
Заслужаны артыст рэспублікі
Віталій ЛАЗАРЭНКА.
Першая гастроль пешшага ў СССР музычнага эксцэнтрыка
Нікалая ТАМАРЫНА.
Пачатак у 9 гадзін веч.
Каса з 12—2 і з 5 гадз. веч.

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 9 ЛІПЕНЯ:
8.30 — «Апошнія паведамленні». 16.05 — канцэрт, 17.00 — перадача для дзяцей на польскай мове, 18.30 — перадача тэкста даклада тав. Якаўлева на IV сесіі ЦВК СССР аб праекце Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР. 20.30 — опера, 23.00 — «Апошнія паведамленні». 24.00 — перадача на замежных мовах.

Выдавецтву газеты «Звязда»
ПАТРЭБНА кваліфікаваная МАШЫНІСТКА.
Звяртацца: Совецкая, 63, другі паверх, да загадчыка выдавецтва.

Памяшк. Яўрэйскага Дзяржаўнага тэатра БССР
З 11 ЛІПЕНЯ ГАСТРОЛІ ЛЕНІНГРАДСКАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДРАМСТУДЫІ.
РЭПЕРТУАР:
М. Горкі— ВАРВАРЫ
А. Карнейчук— БАНКІР
Каса адчынена з 12 да 2 гадз. і з 5 да 9 гадзін вечара.

БЕЛАРУСКІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫ ІНСТЫТУТ НКЗ БССР
абвяшчае ПРЫЕМ студэнтаў
на 1937-38 навучальны год на 1 курс наступных факультэтаў:
1. Агранамічны з паляводчым і плодагародным аддзяленнямі.
2. Зоатэхнічны.
3. Аграхіміі і глебазнаўства.
4. Інжынерна-землеўпарадчы.
Прыём заяў з 20 чэрвеня да 1 жніўня.
Прыёмныя экзамены з 1 па 20 жніўня.
Пачатак заняткаў з 1 верасня.
Да заявы прыкладаюцца: аўтабіяграфія, атэстат аб сканчэнні сярэдняй навучальнай установы, пашпарт (прад'яўляецца асабіста), дзве фотакарткі; ваеннаабавязаныя, апрача вышэйуказаных дакументаў, прад'яўляюць даведку аб адносінах да вайсковай павіннасці.
Заявы і дакументы падаюцца на імя дырэктара інстытута па адрасу: Горы-Горкі, БССР.
ДЫРЭКЦЫЯ.

НАРКАМЗЕМ СССР
ЗАХОДНІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫ ІНСТЫТУТ
абвяшчае ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ
на першы курс зоатэхнічнага факультэта.
Інстытут рыхтуе спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі для сацыялістычнай жывёлагадоўлі.
Прыём заяў праводзіцца з 20 чэрвеня да 1 жніўня.
Заявы падаюцца на імя дырэктара інстытута з прыкладаннем: а) аўтабіяграфіі, б) атэстата аб сканчэнні сярэдняй навучальнай установы (у арыгінале); в) пашпарта (прад'яўляецца асабіста яўны), г) трох фотакартак (здымкі без галаўных убораў, пажадана размерам 4х6 см.), з уласнаручным подпісам паступаючага на кожнай з іх, засведчаных дзяржустановай; д) даведкі аб адносінах да вайсковай службы (для ваеннаабавязаных).
Да прыёмных іспытаў у інстытут дапускаюцца асобы ва ўзросце ад 17 да 35 год, якія маюць заканчаную сярэднюю адукацыю (дзесяцігодка, рабфак, тэхнікум), або атрымаўшыя атэстат аб сканчэнні сярэдняй школы ў парадку экстэрната.
Усе паступаючыя ў інстытут, за выключэннем асоб, прымаемых без іспытаў, згодна правіл прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы Саюза ССР у 1937 г., падвяргаюцца прыёмным іспытам па наступным прадметах: а) па рускай мове (пісьмовы твор, граматыка і літаратура), б) палітграмаце, в) матэматыцы, г) фізіцы, д) хіміі, е) замежнай мове па выбару паступаючага і ж) геаграфіі.
Без прыёмных іспытаў прымаюцца асобы, скончыўшыя сярэднюю школу (дзесяцігодку) і маючыя па асноўных прадметах адзнакі «выдатна», а па астатніх прадметах не ніжэй «добра», а таксама асобы, якія маюць заканчаную вышэйшую адукацыю пры наяўнасці ў іх трохгадовага вытворчага стажу.
Для паступаючых пры інстытуце арганізавана даведачна-кансультацыйнае бюро. Іншагародніх, паступаючых ў інстытут, забяспечваюцца на час іспытаў інтэрнатам. Частка залічаных у інстытут забяспечваецца стыпендыяй і інтэрнатам.
Даведкі для паступаючых асабіста выдаюцца штодзённа ў навучальнай частцы інстытута з 10 да 15 гадзін.
Заявы з дакументамі накіроўваць па адрасу: г. Смаленск, Заходняй вобласці, вул. Окцябрскай рэвалюцыі, дом № 14. Заходні с.-г. інстытут, дырэктару інстытута.
Дырэктар Н. ЗАХАРАЎ.

Маскоўская сельскагаспадарчая акадэмія імя К. А. Тімірязева
абвяшчае ПРЫЁМ студэнтаў
на першы курс наступных факультэтаў:
паляводства, аграхіміі і глебазнаўства, плодагародны, зоатэхнічны і эканамічны.
Прыём заяў да 1 жніўня.
Іспыты — з 1 па 20 жніўня (на іспыты выязджаць толькі па выкліку).
Пачатак заняткаў 1 верасня.
Заявы накіроўваць па адрасу: Масква, 8, Маскоўская Тімірязеўская с.-г. акадэмія, Новае шасе. Прыймовай камісіі.
ДЫРЭКЦЫЯ.

УМОВЫ ПРЫЁМУ
У ДАКТАРАНСКУЮ АСПІРАНТУРУ АКАДЭМІІ НАВУК БССР у 1937 г.
1. Дактаранская аспірантура рыхтуе высокакваліфікаваных навуковых работнікаў-дактароў навук (прафесароў).
2. У лік аспірантаў прымаюцца асобы, якія паспяхова скончылі ВНУ і аспірантуру, зарэкамендавалі сябе ў навукова-даследчай рабоце і маюць вучонае званне дацэнта ВНУ ці старэйшага навуковага работніка навукова-даследчага інстытута. Пры прыёме даецца перавага маючым ступень кандыдата навук.
3. Тэрмін навучання аспірантаў 3 гады. Аспіранты-дактаранты забяспечваюцца стыпендыяй у памеры ад 550—750 руб. у месяц.
4. Прыём адбываецца па спецыяльнасцях: гісторыя Беларусі, літаратура, мова, права, эканоміка, філасофія, агратэхніка, геалогія.
5. Жадаючыя паступіць у аспірантуру павінны ў заяве паказаць абраную спецыяльнасць і прыкласці да заявы наступныя дакументы:
а) дакументы аб сканчэнні ВНУ, аспірантуры і аб прысваенні навуковага звання і ступені кандыдата навук;
б) камандыроўку — члены партыі і комсамольцы ад сваіх ГК і РК, а беспартыйныя — ад адпаведных профаюзных і грамадскіх арганізацый;
в) характарыстыку ад ВНУ і навукова-даследчых інстытутаў, засведчаную камандзіруючай арганізацыяй, аб грамадскай, навуковай і педагагічнай рабоце, засведчаную анкету, біяграфію, друкаваныя працы, даведку аб стане здароўя.
6. Заявы прымаюцца аддзелам кадраў Акадэміі навук БССР (пакой 18, трэці паверх) да 15 жніўня 1937 г.
Увага: Залічаныя ў аспірантуру забяспечваюцца жыллёвай плошчай (сем'і прынятых у аспірантуру жыллёвай плошчай не забяспечваюцца).
За ўсімі даведкамі звяртацца к Навіменнаму сакратару Акадэміі навук БССР.
Прэзідэнт Акадэміі навук БССР акад. СУРТА.

НОВАБЕЛІЦКІ ПЕДРАБФАК
абвяшчае НАБОР студэнтаў
НА 1937-38 навучальны год.
На першы курс з адукацыяй НСШ, на другі курс — з адукацыяй 8 кл. СШ, на трэці курс з адукацыяй 9 кл. СШ.
На трэцім курсе ёсць яўрэйскае аддзяленне.
Пры рабфаку ёсць і вячэрняе аддзяленне, куды прымаюцца асобы без адрыву ад вытворчасці.
Умовы прыёму: паступаючыя трымаюць іспыты на першы курс — па беларускай і рускай мовах і матэматыцы (вусна і пісьмова), па беларускай і рускай літаратуры, геаграфіі і грамадазнаўству (вусна) у аб'ёме НСШ; на другі курс — па ўсіх прадметах 8 кл. СШ; на 3 курс — па ўсіх прадметах 9 кл. СШ.
Паступаючыя на 3 курс яўрэйскага аддзялення трымаюць іспыты і па яўрэйскай мове і літаратуры.
Усе паступаючыя павінны ведаць Сталінскую Канстытуцыю СССР і БССР.
Заявы з дакументамі: а) засведчаную аўтабіяграфію, метрыку, пасведчанне аб адукацыі, аб стане здароўя, а дзвума фотакарткамі і марак на 20 кап. накіроўваць на адрасу: г. Новабеліца, Гомельская раёна, Совецкая, 18, педрабфак.
Прыём заяў да 1 жніўня. Іспыты—з 20 па 27 жніўня. На рабфак прымаюцца асобы ва ўзросце ад 17 да 30 год.
Усе студэнты забяспечваюцца стыпендыяй, а іншагародніх інтэрнатам.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Народны Камісарыят Аховы Здароўя БССР
абвяшчае НАБОР на 1937/38 навучальны год
у наступныя школы МЕДЫЦЫНСКІХ СЯСЦЕР:
1. Віцебская школа
2. Гомельская школа
3. Аршанская школа
4. Полацкая школа
5. Бабруйская школа
6. Мозырская школа
7. Слуцкая школа
8. Лепельская школа
9. Дубровенская школа
10. Жлобінская школа
11. Клімавіцкая школа
12. Мсціслаўская школа
13. Рагачоўская школа
14. Рэчыцкая школа
15. Шклоўская школа
16. Чэрвеньская школа
17. Быхаўская школа
18. Горацкая школа
19. Асіпавіцкая школа
20. Чавуская школа
Усе вышэйпералічаныя школы медыцынскіх сясцёр будуць падрыхтоўваць кваліфікаваных медыцынскіх і ясельных сясцёр з закончанай сярэдняй медыцынскай адукацыяй.
Тэрмін навучання ў школе медыцынскіх сясцёр і ясельных — два гады.
У школы медыцынскіх сясцёр прымаюцца асобы ва ўзросце ад 15 да 35 год, маючыя адукацыю за 7 класаў сярэдняй школы.
Жадаючыя паступіць у школы медыцынскіх сясцёр павінны падаваць заявы ў гарадскія або раённыя аддзелы аховы здароўя (райздравы), дзе адкрываюцца гэтыя школы.
Да заявы неабходна прыкласці наступныя дакументы ў арыгіналах:
1. Атэстат аб адукацыі.
2. Метрычны выпіс, або даведку аб нараджэнні.
3. Даведку аб тым, што стан здароўя не перашкаджае паступленню ў сярэдн. мед. навуч. установу.
4. Дзве фотакарткі з уласнаручным подпісам на іх.
Паступаючыя ва ўзросце ад 16 год і вышэй прад'яўляюць пашпарт пры асабістай яўпы.
Усе паступаючыя падвяргаюцца прыёмным іспытам ў аб'ёме 7 класаў сярэдняй школы па наступных прадметах: беларускай і рускай мовах, матэматыцы, алгебры (вусна і пісьмова), геаметрыі, фізіцы, геаграфіі і палітграмаце (вусна).
Прыём заяў будзе праводзіцца да 1 жніўня. Іспыты—з 1 па 20 жніўня.
Прынятыя ў школы медыцынскіх сясцёр будуць забяспечаны стыпендыяй, згодна існуючых правіл і інтэрнатам ці кватэрнымі грашыма.
НАРКАМЗДРАЎ БССР.

АДДЗЯЛЕННЕ ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ І ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ ВАРОНЕЖСКАГА леса культурнага інстытута
абвяшчае ПРЫЁМ НА ЗАВОЧНАЕ НАВУЧАННЕ ВУЗ'а
па спецыяльнасцях: лесавода-лесага спадарніка і лесавода-лесакультурніка.
Тэрмін навучання 5 год.
Прымаюцца асобы, якія маюць незакончаную вышэйшую асвету ці закончаную сярэднюю.
Паступаючыя падвяргаюцца ўступным іспытам па матэматыцы, фізіцы, хіміі, рускай мове, палітграмаце, геаграфіі і іншаземнай мове.
Без іспытаў прымаюцца скончыўшыя сярэднюю школу на «выдатна» па всіх прадметах і маючыя вышэйшую асвету.
Да заявы прыкладаюцца аўтабіяграфія і дакументы: аб асвеце (арыгінал), даведка аб нараджэнні, дзве засведчаныя фотакарткі, і даведка з месца працы.
Заявы прымаюцца да 1 жніўня.
Парадак здачы ўступных экзаменаў і падрабязныя ўмовы вучобы высылаюцца па запатрабаванню і атрыманню паштовых марак на 50 кап.
Адрас: г. Воронеж, п/о СХИ, Отделение заочного обучения и повышения квалификации ЛКИ, комната 230.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Уп. Галоўлітбела № А—2413. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63. Б., К., С.